НАХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ—БАЯВЫ АГЛЯД РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ СІЛ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Пралетарыі ўсіх краін, аб'ядайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарыскому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 116 (4020)
30 КРАСАВІКА—1 МАЯ
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАЛЫНА

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК—да новых перамог!

Наперад!

Сёньня ўсе пралетары і працоўныя, усе эксплёатуемыя на ўсёй зямной кулі праводзяць дзень 1-га мая—дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасьці і баявога агляду рэвалюцыйных сіл рабочае клясы.

Сёньня пралетары ўсіх краін пад сьцягамі Камінтэрну паказваюць сваю баявую гатоўнасьць да рашаючых клясавых баёў супроць буржуазіі і сацыял-фашызму, за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Сёньня рабочая кляса ўсяго сьвету, усе прыгнечаныя каленіі і паўкаленіі дэманструюць супроць падрыхтоўкі новай імпэрыялістычнай бойні за абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны—СССР.

42 першамай міжнародны пралетарыят і яго ўдарная брыгада—Савецкі Саюз—сустракаюць у пэрыяд, калі найглыбейшы эканамічны крызіс з кожным днём усё мацней і мацней сьціскае за горла капіталістычны сьвет. Два сьветы, дзьве сыстэмы стаяць адна супроць другой. Сыстэма пераможнага сацыялізму і сыстэма паміраючага капіталізму. Мінулы год быў годам найвялікшага гістарычнага пералому, які з усёй яркасьцю паказаў адсутнасьць капіталістычнай сыстэмы і гігантскую перавагу сыстэмы сацыялізму. На фоне растучага развалу сусьветнага капіталізму ў краіне дыктатуры пралетарыяту завяршаецца пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Сусьветная буржуазія задыхаецца ў капазных ціскох эканамічнага крызісу. Найвялікшая ў гісторыі дэпрэсія пануе ва ўсім капіталістычным вытворстве. Няма такой буржуазной краіны, няма такой капіталістычнай дзяржавы, дзе-б крызіс не разьвіваўся з усё узрастаючай сілай.

Збанкрутавала хвасьлівая пропаведзь міжнароднай сацыял-дэмакратыі аб новым росьвіце капіталізму. Збанкрутавалі і разьлеяліся на шэвох міэрныя тэорыі агентаў буржуазіі—правых апартуністаў аб капіталістычнай стабілізацыі. Сусьветны эканамічны крызіс, на аснове агульнага крызісу капіталізму, няўхільна рушыцца наперад. У краінах капіталу з кожным днём усё больш скарачаецца вытворства і бесьпералынна расьце беспрацоўе. З кожным днём закрываюцца усё новыя і новыя фабрыкі і заводы, рудніки і капальні. Кожны дзень дзесяткі тысяч пралетараў выкідваюцца на вуліцу. Гісторыя яшчэ ня ведала такога беспрацоўя, якое пануе зараз ва ўсіх буржуазных краінах, ва ўсіх каленіях і паўкаленіях. Амаль 35.000.000 прамысловых рабочых ня маюць ніякай работы. Беспрацоўе ахапіла і шматмільённыя масы сяльска-гаспадарчага пралетарыяту. У капіталістычных краінах эканамічны крызіс расьце на толькі ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы. Сельска-гаспадарчы крызіс выклікае казаную паўпэрыясацыю сялянства і рэзкае дэградацыі дробных і сярэдніх сялянскіх гаспадарак.

Увесь цяжар эканамічнага крызісу буржуазія імкнецца перакласьці на плечы рабочае клясы. Капіталізм пускае ў ход усе сілы і сродкі, каб выйсьці з крызісу шляхам эканамічнага грабежніцтва пралетарыяту і арганізацыі новай антысавецкай вайны. Пры актыўнай дапамозе сваіх сацыял-фашысцкіх лакеяў—сацыял-дэмакратаў буржуазія шалёна наступае на зарплату, на сацыяльнае страхаваньне, на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы. У каленіях і паўкаленіях, дзе пралетарскія масы эксплёатуюцца і імпэрыялізмам і туземнай буржуазіяй, наступленьне на рабочую клясу адбываецца з яшчэ больш асаблівай сілай. Шалёны фашысцкі тэрор пануе ў акупаванай Заходняй Беларусі. На удар рабочых масы адказваюць ударам. Міжнародны пралетарыят у адказ на наступленьне капіталу арганізуе пад кіраўніцтвам камуністычных партый масавае контрнаступленьне.

Капіталістычная сыстэма асуджана. Не разлажэньне набывае ўсё большыя і большыя разьмеры.

Сацыялістычная сыстэма перамагае. Ударная брыгада пралетараў усіх краін, усіх каленій і паўкаленій—СССР—пераможна будуе сацыялізм. Савецкі Саюз і яго перадавы фарпост—БССР— посьпехам ажыцьцяўляюць пяцігодку за чатыры гады.

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам партыі Леніна Савецкая Беларусь і ўвесь СССР уступілі ў пэрыяд сацыялізму. Перавышаны і далёка пакінуты ззаду першапачатковыя намячэньні пяцігодкавага плану вялікіх работ. У краіне дыктатуры пралетарыяту нябачанымі тэмпамі разгортваецца сацыялістычная індустрыялізацыя. Разьбіты ўшчэнт капітулянцкія прагнозы контр-рэвалюцыйнага трацкізму аб капіталістычным пераражэньне СССР. Зруйнавана кулацкая праграма праваапартуністычнай апазыцыі—праграма рэстаўрацыі капіталізму. На базе шпаркага разьвіцьця цяжкай індустрыі—гэтай адзінай асновы сацыялізму, з нябывалай сілай расьце гаспадарчы і культурны ўздым СССР. У Савецкім Саюзе няма беспрацоўя. У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі 518 новых індустрыяльных гігантаў і 1040 машынна-трактарных станцый уключаюцца ў фронт разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Усе новыя і новыя сотні тысяч пралетараў улізваюцца ў прамысловасьць. Магутным тэмпам растуць кадры рабочае клясы. Расьце мастацтва ўзьдым пралетарыяту і ўсіх працоўных. За рубяжом стыхійна расьце беспрацоўе, расьце разгул капіталістычнай эксплёатацыі, мацней сьціскаецца пятля капіталістычнага работы. Вакол шыі шырокіх пралетарскіх мас. У Савецкім Саюзе, дзе ліквідавана беспрацоўе, усё новыя і новыя прадпрыемствы пераводзяцца на 7-гадзінны работы дзень, расьце магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, [illegible] ударны энтузіязм рабочае клясы.

Адсталыя масы сялянства крута і разрыўна [illegible] на шлях сацыялізму, [illegible] калектывізацыі. Дылікі [illegible] ЦК УсеКП(б) аб каштыцы [illegible] 1931 годзе 50 [illegible] у бягучым [illegible] проц. усіх [illegible]-серадняцкіх гаспадарак [illegible] сяўным ажыцьцёўленьне. Больш чым 45 проц. бяднякі-серадняцкіх [illegible] зруйнаваны межы індустрыялізацыі [illegible] і аб'ядналіся ў [illegible] магутная хваля калектывізацыі [illegible] прыліву. На аснове [illegible] ліквідуецца [illegible] апора міжнародных [illegible] контр-рэвалюцыі [illegible] у сялянства. У суадносінах клясавых сіл на вёсцы адбыліся найвялікшыя гістарычныя зьмены. Калгаснае сялянства стапа асноўнай і моцнай апорай савецкай улады на вёсцы. Да канца пяцігодкі суцэльная калектывізацыя будзе завершана.

«З пункту погляду ўнутраных сіл пытаньне аб перамозе сацыялізму ў нашай краіне вырашана і перамога сацыялізму ў нашай краіне поўнасьцю забясьпечана» (В. М. Молатаў).

1 мая пралетарыят БССР і ўсяго Савецкага Саюзу сустракае з новымі, нязьмерна вялікімі перамогамі сацыялістычнага будаўніцтва. Бакінскія і грозьненскія нафтавікі, паказаўшы гэраічныя рэвалюцыйныя тэмпы работы, выканалі сваю пяцігодку за 2½ гады. Сьледам за нафтавікамі перадавыя прадпрыемствы сацыялістычнай індустрыялізацыі адзін за адным рапартуюць аб ажыцьцяўленьні пяцігадовага пляну. За 2½ гады выканала пяцігодку гарбарная прамысловасьць Савецкай Беларусі.

Толькі пад выпрабаваным ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі пралетарыят Савецкага Саюзу здолеў ужо ўступіць у пэрыяд сацыялізму. Толькі бязьлітасная і непрымірымая барацьба за генэральную лінію партыі супроць правага ўхілу—галоўнай небясьпекі, супроць «левага» апартунізму, супроць права-«лявацкага» блёку забясьпечыла ўсе посьпехі перамогі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Разграміўшы контр-рэвалюцыйны трацкізм і правы ўхіл, разгортваючы пераможнае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, камуністычная партыя вядзе рабочую клясу і ўсіх працоўных да канчатковай перамогі сацыялізму.

Буржуазіі не пасіле вырашыць нацыянальнае пытаньне. У буржуазных краінах нацыянальная праблема абвострана да найвышэйшага пункту. Па той бок мяжы нацыянальныя меншасьці стогнуць пад падвойным уціскам капіталістычнай эксплёатацыі — сацыяльным і нацыянальным. У Савецкім Саюзе вырашана нацыянальнае пытаньне. У СССР расьце і мацнее брацкі саюз усіх нацыянальнасьцей. Гігантаўна посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі эьлўлюцца вынікам няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі. У выніку непрымірымай барацьбы з усякімі ўхіламі ад ленінскай нацпалітыкі пралетарыят БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры брацкай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу дабіўся нябывалага росквіту нацыянальнай культуры, сацыялістычнай па сваім зьмесьце. Наносячы руйнуючыя ўдары па вялікадзяржаўным шавізьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, па беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызьме і нацыянал-апартунізьме і шавінізмах усіх масьцей і колераў, КП(б)Б забясьпечыла вялізарны гаспадарчы і культурны ўздым працоўных нацменшасьцей і рашуча ліквідуе рэшткі фактычнай нацыянальнай няроўнасьці. БССР ператвараецца з адсталай каленіі расійскага царызму ў краіну індустрыяльных гігантаў і камбінатаў, саўгасаў і калгасаў.

Сусьветны эканамічны крызіс рэзка абвастрыў і паглыбіў усе супярэчнасьці капіталізму. Сусьветны капіталізм курчыцца ў сударагах крызісу і разьдзіраецца ўласнымі супярэчнасьцямі. Каб выратаваць сябе, каб знайсьці выхад, каб адтэрміноваць сваю пагібель, капітал рыхтуецца да новых войн і ў першую чаргу да інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Са дня ў дзень скарачаецца капіталістычнае вытворства і толькі адна галіна прамысловасьці—ваенная—ня ведае ніякага крызісу. Дні і ночы працуюць вялізарныя ваенныя заводы. Растуць узбраеньні капіталістаў. За бясконцымі пацыфісцкімі заявамі, за няэлічонымі разбраенчымі, аграрнымі і пан-эўрапэйскімі канфэрэнцыямі, за нахабнымі енкамі аб «савецкім дэмпінгу» і «прымусовай працы» ў СССР», буржуазія, пры чынным удзеле сацыял-фашызму, вядзе актыўную і ўпартую падрыхтоўку новых імпэрыялістычных антысавецкіх войн.

Працэсы «прампартыі» і «саюзнага бюро» ЦК РСДРП (М) выкрылі існаваньне вялізарнай міжнароднай змовы супроць Савецкага Саюзу. Па загаду французкага імпэрыялізму і польскага фашызму буржуазна - памешчыцкая прампартыя, кулацка-эсэраўская «ТКП», меншавікі-шкоднікі і беларуская контрэвалюцыя—нацыянал-дэмакраты, гэтыя нацыянал-фашысты рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць краіны Саветаў.

Пляны імпэрыялістаў выкрыты. Рэвалюцыйная пільнасьць рабочай клясы перамагла. Шкоднікіцкія арганізацыі разгромлены. Аднак, пагроза інтэрвэнцыі ня зьнята з парадку дня сусьветнага імпэрыялізму. Капіталізм прабуе выйсьці з крызісу за кошт рабочай клясы, за кошт СССР. Міжнародная буржуазія імкнецца да таго, каб зрабіць пралетараў СССР сваімі каленіяльнымі рабамі. Чым больш паглыбляецца сусьветны эканамічны крызіс і расьце пераможнае будаўніцтва сацыялізму ў Савецкім Саюзе, чым мацней разбураецца капіталістычная сыстэма, тым з яшчэ большым шаленствам буржуазія рыхтуе антысавецкую вайну. Капіталізм мабілізуе ўсе сілы міжнароднай контрэвалюцыі, каб зруйнаваць СССР агнём і мячом інтэрвэнцыі.

У сьвятле гэтых фактаў, як ніколі, выяўляецца ўся контр-рэвалюцыйная, здрадніцкая роля міжнароднай сацыял-дэмакратыі. Сацыял-дэмакраты — сацыял-фашысты, як галоўная сацыяльная апора буржуазіі, ідуць у авангардзе падрыхтоўкі новых антысавецкіх войн. Сусьветны меншавізм ператварыўся ў штаб арганізацыі інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Сацыял-фашызм стаў самым надзейным майстрам буржуазіі па сабатажы і зрыве рэвалюцыйнай барацьбы рабочай клясы, па здрадніцтве забастовак і стачак пралетарыяту. Рукамі сацыял-фашызму, рукамі сацыял-дэмакратычных урадаў капітал праводзіць наступленьне на рабочую клясу.

Разам з ростам ваеннай небясьпекі, расьце і мацнее баявая гатоўнасьць пралетарыяту пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу, даць адпор правакацыйнай падрыхтоўцы новай антысавецкай вайны. Мацнее і шырыцца адзіны пралетарскі фронт. Пралетары ўсіх краін, усіх каленій і паўкаленій згуртоўваюць свае рады вакол камуністычных партый і пад іх кіраўніцтвам разгортваюць рашучую барацьбу супроць падрыхтоўкі новай імпэрыялістычнай бойні за абарону сваёй бацькаўшчыны —Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Сусьветны эканамічны крызіс у цэлым радзе краін стварыў сур'ёзныя прадпасылкі для рэвалюцыйнага крызісу. У краінах капіталу абвастраецца клясавая барацьба. Пад ударамі рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян Гішпаніі зрынута гішпанская манархія. Мільённыя масы каленій і паўкаленій узьнімаюцца на барацьбу з папітыкай буржуазіі імпэрыялісцка - каленіяльнага грабежніцтва. Ва ўсім сьвеце нарастае хваля магутных рэвалюцыйных клясавых баёў. У адказ на націск эксплёатараў і іх сацыял-фашысцкіх лёкаў мацнее, пад кіраўніцтвам кампартый, адзіны рэвалюцыйны пралетарскі фронт. На ўсёй зямной кулі ўсё новыя і новыя масы эксплёатуемых у Польшчы і Нямеччыне, у Індыі і Кітаі выходзяць на фронт барацьбы супроць дыктатуры буржуазіі, за сусьветны Кастрычнік.

У дзень 1 мая мільённыя масы пралетараў і ўсіх прыгнечаных усяго сьвету цясьней згуртуюць свае рады для барацьбы за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю. Ні шалёны сярэднявяковы тэрор буржуазіі, ні кулі і газавыя бомбы, ні арышты і праваакацыі, ні масавыя расстрэлы ня спыняць магутнага руху першамайскіх пралетарскіх дэманстрацый.

Камуністычныя партыі ўсяго сьвету, ліквідуючы свае адставаньне ад задач рэвалюцыйнага ўздыму, стаўшы на чале растучай рэвалюцыйнай актыўнасьці міжнароднага пралетарыяту яшчэ больш узмоцняць адзіны пралетарскі фронт і павядуць масы прыгнечаных да новых рашаючых баёў супроць буржуазнай дыктатуры і сацыял-фашызму, за дыктатуру пралетарыяту.

Шматмільённыя масы пралетараў становяцца пад сьцягі Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Ва ўсім сьвеце нарастае магутны рэвалюцыйны ўздым.

Рабочыя і работніцы, калгасьнікі і калгаснікі Савецкай Беларусі адзначаць першамайскія дні новым уздымам сваёй барацьбы за найхутчэйшае выкананьне і перавыкананьне гэтых задач.

На пасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва ў ажыцьцяўленьні прамфінпляну, у разгортваньні калектывізацыі і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы, у нацыянальна-культурным будаўніцтве яшчэ не ліквідаваны пасобныя сур'ёзныя прарывы.

У дзень 1-га мая вышэй тэмпы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху, вышэй тэмпы бальшавіцкай барацьбы за перавыкананьне прамфінпляну! Новымі сотнямі і тысячамі ударных брыгад, аўладаньнем вышынямі тэхнікі, бо «тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё» (Сталін) — сустрэнем міжнародны пралетарскі дзень.

Усе сілы, усю энэргію рабочай клясы — на развортваньне ўдарнага руху, на барацьбу за якасьць прадукцыі, за рацыяналізацыю вытворчасьці. Раўненьне на ўдарнікаў гарбарнай прамысловасьці і гомельскай энстрастанцыі, якія ўжо ажыцьцявілі сваю пяцігодку за 2 з паловай гады.

Гаспадарчы разрахунак — магутны вагар сацыялістычнага плянаваньня і кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Баявымі тэмпамі ажыцьцявім дырэктывы партыі і ўраду аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак. Давядзем фінплян да варштату, умацуем фінансавую дысцыпліну. За праверку рублём, за цьвёрдае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку.

Масавая сяўба разгарнулася. Між тым, далёка ня ўсе раёны БССР падрыхтаваны да пасеўнай кампаніі. Тэмпы калгаснага прыліву ўсё яшчэ невыстарчальныя. Не ліквідавана ганебнае адставаньне ў кантрактацыі яравых пасеваў. Перавод на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, адбываецца марудна. Непьга больш цярпець гэтых надалушчальных прарываў. ДРУГАЯ БАЛЬШАВІЦКАЯ СЯЎБА ПАВІННА БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНА ПА - БАЛЬШАВІЦКУ. Першамайскія дні кожны раён абавязан адзначыць ударным разгортваньнем масавай сяўбы, зьнішчэньнем усіх недахопаў у падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі, арганізацыяй новага магутнага калгаснага прыліву. Усе саўгасы і калгасы — на зьдзельную работу. Шырэй сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарны рух сярод калгасных і аднаасобных бядняцка - серадняцкіх мас. У бліжэйшыя дні праграма кантрактацыі яравых пасеваў павінна быць поўнасьцю ажыцьцёўлена.

Вакол калгаснай сяўбы абвастраецца клясавая барацьба. Кулак шалёна змагаецца супроць калектывізацыі і працьве сарваць пасьляховае правядзеньне веснавой сяўбы. Мацней бязьлітасны ўдар па кулаку і яго права - «лявацкай» агентуры.

Уцягнем новыя бядняцка - серадняцкія масы ў калгасы. Веснавая сяўба—самы спрыяючы момант для арганізацыі новага калгаснага прыліву — павінна быць праведзена пад знакам упартай барацьбы за штодзённае нарастаньне тэмпаў калектывізацыі.

У першамайскія дні ліквідуем усе прарывы ў выкананьні загатоўчых плянаў. Дамо пён сацыялістычнай індустрыі. Забясьпечым ня толькі поўнае ажыцьцяўленьне, але і перавыкананьне праграмы яравых пасеваў і тэхкультур.

Без галавакружэньня ад посьпехаў, без апартуністычнага ўяадніцтва пры труднасьцях, па - бальшавіцку завяршым будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі БССР у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

У рашучай непрымірымай барацьбе за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацпалітыку, супроць правага апартунізму, які і надалей застаецца галоўнай небясьпекай, супроць «левых» загібшчыкаў, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму — асноўнай перашкоды ў ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыі, супроць беларускага контр - рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, нацыянал - апартунізму і іншых шавінізмаў—забясьпечым ажыцьцяўленьне гістарычнай праграмы трэцяга году пяцігодкі.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе Цэнтральнага Камітэту — наперад, да новых рашаючых перамог, да канчатковай перамогі сацыялізму!

Адозва Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу

РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ ЎСІХ КРАІН! УСЕ ПРАЦОЎНЫЯ І ПРЫГНЕЧАНЫЯ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА СВЕТУ! ДА ВАС, НАЕМНЫХ РАБОЎ КАПІТАЛУ, МІЛЬЁНАЎ АХВЯР КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ І КРЫЗІСУ, ДА ВАС, ДЗЕСЯТКАЎ МІЛЬЁНАЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ, ДА ВАС, КАЛЁНІЯЛЬНЫХ РАБОЎ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ, КАГО ПРАСЬЛЕДУЕ БУРЖУАЗНАЯ ДЫКТАТУРА, КАГО ДУШЫЦЬ ФАШЫСЦКІ ТЭРОР, КАГО ЎВОДЗІЦЬ У ЗМАН ІІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ, КАГО ІМПЭРЫЯЛІЗМ РЫХТУЕ Ў ЯКАСЬЦІ ГАРМАТНАГА МЯСА КІНУЦЬ Ў ПЕКЛА НОВАЙ ВАЙНЫ, ЗВАРАЧАЕЦЦА Ў ДЗЕНЬ 1-ГА МАЯ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ З ЗАКЛІКАМ ДА НЕПРЫМІРЫМАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ СЫСТЭМЫ. НІКОЛІ ЯШЧЭ КАПІТАЛІЗМ НЕ ВЫКРЫВАЎ ТАК ЯСНА СВАЁЙ НЯЗДОЛЬНАСЬЦІ І СВАЁЙ КЛЯСАВАЙ ЖОРСТКАСЬЦІ, ЯК У ГЭТЫ ГОД НАЙВЯЛІКШАГА Ў ГІСТОРЫІ КРЫЗІСУ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ. ГОЛАД І ГАЛЕЧА, ШАЛЁНАЕ ЗНІЖЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ І МАСАВЫЯ ЗВАЛЬНЕНЬНІ, ГРАБЕЖНІЦТВА САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАНЬНЯ І НЯЗНОСНЫЯ ПАДАТКІ, РЭАКЦЫЯ І ФАШЫСЦКІ ТЭРОР, ВАЙНА І ЗРУЙНАВАНЬНЕ КАЛЁНІЯ—ВОСЬ ПАЛІТЫКА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ, ВОСЬ СПРОВЫ КАПІТАЛІСТАЎ ЗНАЙСЬЦІ ВЫХАД З КРЫЗІСУ.

Мы пытаемся ў вас: хіба няма для працоўных іншага выхаду з крызісу, выхаду з беспрацоўя, голаду, галечы? Гэты выхад ёсьць. Гэты выхад вам паказвае сусьветная партыя пралетарыяту, партыя сусьветнай рэвалюцыі—Камуністычны Інтэрнацыянал. Гэты выхад —зьвяржэньне буржуазнай дыктатуры, устанаўленьне дыктатуры пралетарыяту, сацыялізм. Прыклад Савецкага Саюзу цераканаўча гаворыць аб тым, што гэта адзіна верны выхад для працоўных мас.

У той час, як у краінах капіталу закрываюцца сотні і тысячы фабрык і заводаў, у Савецкім Саюзе гігантскімі тэмпамі расьце сацыялістычная прамысловасьць. У СССР няма беспрацоўя. У гэтым годзе 2 млн. новых рабочых увойдуць у вытворчасьць. На ўчора яшчэ пустынных раўнінах вырастаюць новыя гарады. У самых адсталых частках Савецкага Саюзу будуюцца палацы працы і культуры. Вырастаюць сацыялістычныя гіганты сельскай гаспадаркі—калгасы і саўгасы. Дасягненьні тэхнікі і сацыялістычная арганізацыя працы прыходзяць на зьмену прымітыўнай катаржнай працы селяніна, выводзячы мільёны калгасьнікаў на шырокі шлях дабрабыту і культуры. З году ў год павышаецца зарплата рабочых і служачых, з кожным днём растуць фонды сацыяльнага страхаваньня. Усе прамысловасьць пераходзіць на 7 гадзінны працоўны дзень. Пад націскам сацыялістычнага наступленьня выкарчоўваюцца апошнія карэньні капіталізму. Зьнікаюць апошнія эксплёататары. Кулацтва ліквідуецца як кляса на базе суцэльнай калектывізацыі.

Ва ўсім капіталістычным сьвеце люта самая жорсткая палітычная рэакцыя. Буржуазія рукамі фашыстаў і сацыял-дэмакратаў душыць стачкі, топіць у крыві дэманстрацыі, руйнуе рэвалюцыйныя рабочыя арганізацыі, сьпішчае пралетарскі друк, жорстка распраўляецца з рэвалюцыйным рухам сялянства.

У Савецкім Саюзе—краіне найшырэйшай савецкай дэмакратыі—сацыялізм патхнёў мільёны пралетараў і калгасьнікаў вялікім плянам эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Мільёны рабочых уступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Стваравацца дзесяткі тысяч ударных брыгад. Праца становіцца справай гонару і славы. Абуджаныя да актыўнасьці і творчасьці рабоча-сялянскія масы ва ўпартай барацьбе са шкодніцтвам і сабатажам, перамагаючы вялізарныя труднасьці, сьвядома ідучы па часовым ахвяры, упэўненым крокам пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будуюць новае сацыялістычнае грамадзтва.

У краінах капіталу пад прыкрыцьцём версальскай сыстэмы стогнуць сотні прыгнечаных народаў і нацыянальных меншасьцей. Польскі фашызм паладжвае крывавую лазню ў вёсках Зах. Украіны, французкі імпэрыялізм, зрабіўшыся жандарам Эўропы, душыць Эльзас-Лётарынгію. Урад кіруючай партыі II-га Інтэрнацыяналу, партыі Макдональда, агнём і мячом распраўляецца з народамі каленій, што прачынаюцца.

У Савецкім Саюзе сотні народаў, што раней бязьлітасна прыгняталіся царызмам, вызваленыя пралетарская рэвалюцыяй, арганізавалі брацкі саюз і скарыстоўваюць свае сацыяльнае і нацыянальнае разьвіцьцё для ўсё новых і новых эканамічных і культурных заваяваньняў.

Ніколі яшчэ перад працоўнымі ўсяго сьвету не выступала так ясна перавага сацыялістычнага пляну над капіталістычнай анархіяй, перавага сацыялізму над капіталізмам.

Іменна таму такі вялікі перапалох імпэрыялізму перад посьпехамі сацыялізму ў СССР. Іменна таму імпэрыялісты так сьпішваюцца з падрыхтоўкай контр-рэвалюцыйнай вайны супроць СССР. На чале арганізатараў інтэрвэнцыі ідзе французкі імпэрыялізм. Пуанкарэ і Брыян, вартыя патомкі Кавен'яка і Т'ера, ператварылі бацькаўшчыну парыскіх камунараў у вогнішча сусьветнай контр-рэвалюцыі. Польшча, Чэха-Славакія, Румынія, Фінляндыя, Латвія і Эстонія—гэтыя васалы французкага і ангельскага імпэрыялізму—гатовы па першым сыгнале з Парыжу і Лёндану рушыць свае войскі на бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету.

Каты рэвалюцыйнага пралетарыяту, прасьледвальнікі камунізму, прафэсыянальныя атручвальнікі сьвядомасьці народных мас, сёньня аб «прасьледваньні рэлігіі» ў СССР. Біржавыя махэры, каралі вугалю і нафты, спэкулянты і іх продажны друк распускаюць паклёпы аб «савецкім дэмпінгу». Драпежнікі капіталістычнага прыбытку, што смокчуць кроў са сваіх белых, чорных і каляровых рабоў, крычаць аб «прымусовай працы» ў СССР. Гэтае злобнае выцьцё, бязьлікія праваакацыі, таксама як і «мірныя пляны» п. Брыяна аб «злучаных штатах Эўропы», так і пацыфісцкія рэвалюцыі II-га Інтэрнацыяналу,—усё гэта зьвяньні аднаго ланцуга, падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Пралетары ўсіх краін, і перш за ўсё вы, пралетары Францыі, Англіі, Нямеччыны, Чэха-Славакіі, Польшчы, Румыніі, Фінляндыі! Будзьце на варце СССР—вашай сацыялістычнай бацькаўшчыны! Памятайце, што ваша актыўнасьць ваша рэвалюцыйная барацьба прымусіла імпэрыялістаў ужо два разы адкладваць інтэрвэнцыю! Рыхтуйцеся ператварыць контр-рэвалюцыйную імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую, адзіна справядлівую вайну эксплёатаваных супроць эксплёататараў! Памятайце, што ад вашай актыўнасьці ў першую чаргу залежыць быць ці ня быць вайне. Станьце ўсе, як адзін на абарону СССР—ударнай брыгады сусьветнай рэвалюцыі! Імпэрыялісты рыхтуюцца аднавіць капіталізм у СССР, устанавіць ваенную дыктатуру, зноў прыняволіць сотні народаў, вызваленых Кастрычніцкай рэвалюцыяй, ператварыць у сваю каленію і ў дзесяць раз павялічыць уціск працоўных уласных краін.

Рабочыя і работніцы! Ведайце, што готыя пляны імпэрыялізму палкам і поўнасьцю падтрымлівае і актыўна абараняе міжнародная сацыял-дэмакратыя.

Рабочыя і работніцы! І перш за ўсё вы, сацыял-дэмакратычныя рабочыя, выкрывайце сацыял-дэмакратычных правадыроў! Няхай яны адкажуць перад вамі за агіднае штрэйкбрэхэрства ў часе стачак у Руры, Лянкашыры, Паўднёвым Уэльсе, у часе стачкі горнарабочых ва Францыі! Няхай дадуць адказ за дапамогу буржуазіі ў справе зьніжэньня заработнай платы і сацыяльнага страхаваньня. Няхай адчытаюцца перад вамі за палтрыманьне, якое аказвае нямецкая сацыял-дэмакратыя ўраду Брунінга—ураду правядзеньня фашысцкай дыктатуры, ураду голаду і тэрору. Няхай адкажа II-гі Інтэрнацыянал, за агіднае здрадніцтва французкіх сацыялістаў Ванкураў і Блюмаў, гэтых агентаў генэральнага штабу контр-рэвалюцыі. Няхай II-гі Інтэрнацыянал вытлумачыць вам паводзіны «рабочага» ўраду Англіі, кінуўшага ў турмы больш 50 тыс. змагароў індыйскай рэвалюцыі. Прыцягнеце да адказнасьці II-гі Інтэрнацыянал за яго ўдзел у падрыхтоўцы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР, прымусьце яго адказаць за агідныя паводзіны расійскіх меншавікоў, за іх шкодніцтва і падбухторваньне да вайны супроць СССР, за яго падтрыманьне Чай-Кан-шы, ката кітайскай рэвалюцыі. Няхай II-гі Інтэрнацыянал адчытаецца перад вамі за агіднае здрадніцтва гішпанскіх сацыялістаў, якія дапамагаюць у разгар рэвалюцыі перамозе фашысцкай дыктатуры.

Рабочыя і работніцы—члены сацыял-дэмакратычных партый, выходзьце з радоў II-га Інтэрнацыяналу—інтэрнацыяналу штрэйкбрэхэраў, паліцэй-прэзыдэнтаў, падбухторшчыкаў імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі ў СССР і савецкіх раёнах Кітаю, ганебнага саюзьніка здухаючага капіталізму.

Пралетары ўсіх краін, ад вас залежыць ці ўдасца II-му Інтэрнацыяналу

яшчэ раз, як у 1918 г., выратаваць капіталізм ад пралетарскай рэвалюцыі.

Калі капіталістычная стабілізацыя прыходзіць канец, калі набліжаецца крах разбойніцкай вэрсальскай сыстэмы, калі ў лягеры імпэрыялізму панує няўпэўненасьць і неспакой,—ад вашай сьвядомасьці, арганізаванасьці і актыўнасьці залежыць—удасца ці ня ўдасца буржуазіі знайсьці капіталістычны выхад з крызісу.

Камуністычны Інтэрнацыянал у дзень 1-га мая шле ад імя міжнароднага рэвалюцыйнага пралетарыяту гарачае баявое прывітаньне гэраічнаму, пралетарыяту СССР і яго кіраўніку—ленінскай партыі, сотням тысяч ударнікаў і дзесяткам мільёнаў калгасьнікаў, што завяршаюць, ня гледзячы на шкодніцтва ўнутраных і замежных клясавых ворагаў, пабудову фундаманту сацыялізму.

Саветам Кітаю, гэраічнай Чырвонай армії кітайскай рэвалюцыі і дзесяткам мільёнаў рабочых і сялян Кітаю, што вядуць бяспрыкладную барацьбу супроць крывавага тэрору гаміндынаўскіх генэралаў, супроць сусьветнага імпэрыялізму, за Савецкі Кітай! Рабоча-сялянскім масам Гішпаніі, якія падняслі сьцяг паўстаньня супроць цямнічыкаў і капіталістаў, за хлеб, за волю, за ўладу! Пралетарыяту Нямеччыны, што рыхтуе на чале шырокіх мас гарадзкой і вясковай беднаты, наперакор сацыял-паліцэйскаму тэрору і асадпаму становішчу, пад выпрабаваным кіраўніцтвам 200-тысячнай камуністычнай партыі, контр-наступленьне на буржуазію за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, за хлеб, за спабоду, за ўладу, за Савецкую Нямеччыну! Рэвалюцыйным рабочым і сялянам Польшчы, якія, ня гледзячы на пячуваны тэрор Пілсудскага, атакуюць польскі фашызм і змагаюцца за Савецкую Польшчу! Рабоча-сялянскім масам Індыі, усім змагаром і гэроям вялікай індыйскай рэвалюцыі і яе адзінаму правадыру—маладой камуністычнай партыі Індыі! Рэвалюцыйным паўстанцам Інда - Кітаю, што падпімаюцца супроць крывавага французкага імпэрыялізму! Рабочым, работніцы, беспрацоўным, служачым, беднаце гарадоў і вёсак, пралетарская моладзь, жоншчы рабочых, прыгнечаным народы каленій і поўкаленій, стварайце адзіны непераможны фронт усіх працоўных і прыгнечаных супроць эксплёататараў і прыгнятальнікаў!

Рабочыя і калгасьнікі СССР! Бальшавіцкімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, новымі сотнямі фабрык, заводаў

КОЖНЫ ДЗЕНЬ БАЛЬШАВІЦКАЙ БУДОЎЛІ

НЯСЕ НОВЫЯ ПЕРАМОГІ НА ФРОНЦЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ

КП(б)Б АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЕ ЛЕНІНСКУЮ НАЦПАЛІТЫКУ У НЕПРЫМІРЫМЫМ ЗМАГАНЬНІ З ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫМ ШАВІНІЗМАМ—ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ, БЕЛАРУСКІМ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМАМ І ШАВІНІЗМАМІ УСІХ КОЛЕРАЎ

Першамайскае прывітаньне пралетарам і працоўнаму сялянству Заходняй Беларусі, якія змагаюцца супроць белапанскіх акупантаў і іх лёкаяў—нацыянал-фашыстаў—Астроўскіх, Луцкевічаў і К°

Мы бязупынна будуем

нацыянальную пралетарскую культуру

«Вырашыць нацыянальную праблему можа толькі пралетарыят і толькі пасьля завяваньня ўлады». Гэтае палажэньне, падкрэсьленае кастрычніцкім пленумам ЦК КП(б)Б, з асаблівай выразнасьцю ілюструецца на прыкладзе разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Пралетарыят СССР, разгортваючы пад кіраўніцтвам партыі наступленьне па ўсім фронце, бязьлітасна выціскаючы капіталістычныя элемэнты, ліквідуючы кулацтва як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі, кожны дзень адзначае усё новымі і новымі перамогамі ў галіне будаўніцтва прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Посьпехі будаўніцтва сацыялізму стварылі вялізарныя магчымасьці для ліквідацыі рэштак эканамічнай няроўнасьці і пасьпяховага разгортваньня будаўніцтва культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Кожны год прыносіць усё большыя і большыя перамогі ў справе зьнішчэньня рэштак спрадвечнай адсталасьці, цемры, у справе зьнішчэньня спадчыны царызму—няпісьменнасьці і арганізацыі новых навучальных і іншых культурных устаноў.

Пяцігадовы плян прадугледжваў ліквідацыю няпісьменнасьці і ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня скончыць у 1932-33 г. Настойлівая бальшавіцкая работа забясьпечыла магчымасьць ужо ў 1931 годзе закончыць у асноўным ліквідацыю няпісьменнасьці і ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня за 4-х гадовую пачатковую школу.

Праз цэлы рад форм (культпаход, манэўры, эстафэта) мы ўзялі высокія тэмпы работы ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці, дабіўшыся за апошні год такіх колькасных паказальнікаў.

Шпарка разгортваецца сетка двухгадовых школ малапісьменнасьці.

Ліквідацыя ў асноўным няпісьменнасьці, ахоп школамі малапісьменных 200 тысяч чалавек—вось суровы прыгавар над цэмрай, некультурнасьцю, адсталасьцю.

Разгортваючы сапраўды шырокую работу ў галіне народнай асьветы, мы далёка абмінулі дарэвалюцыйныя лічбы ахопу школамі дзяцей 8-11-гадовага ўзросту. Ахоп дзяцей гэтага ўзросту дасягнуў 95-98 проц.

Шырыня разгорнутай работы ў справе народнай асьветы асабліва відавочная тады, калі мець на ўвазе лічбовыя паказальнікі будаўніцтва школ. За апошнія два гады колькасьць школ першага канцэнтру павялічылася НА 832. Толькі ў гэтым годзе адкрыта 1.787 новых камплектаў і 360 груп другога канцэнтру.

Разам з павялічэньнем колькаснага ліку школ праводзіцца вялікая работа ў справе паляпшэньня якасьці работы праз перавод іх на палітэхнічныя рэйкі і ўзмацненьне барацьбы з чужымі, клясава-варожымі, нацыяналістычнымі плынямі.

Патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва паставілі перад партыяй ва ўсю шырыню праблему кадраў. Гэтая праблема асабліва востра паўстала ва ўмовах БССР, дзе спадчына царызму ў справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва усё яшчэ дае сябе адчуваць.

АРГАНІЗАЦЫЯ 13 ВНУ, 35 РАБФАКАЎ, 81 ТЭХНІКУМАЎ, 34 ШКОЛ ФЗВ, ЦЭЛЫ РАД ШКМ І ІНШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ паказваюць, што ў справе вырашэньня гэтай важнейшай праблемы мы маем відавочныя дасягненьні.

Апошнія гады характэрны значным пашырэньнем выдавецкай справы.

Даволі прывесьці такія лічбы, як павялічэньне колькасьці аркушаў да 12.207 ў 1931 г. супроць 1,924 у 1929 г., каб бачыць велічыню нашых посьпехаў у гэтай галіне.

Сэнс гэтых посьпехаў заключаецца ня толькі ў колькасным пашырэньні выдавецкай справы, але самае галоўнае ў якасьці, у тым, што і на выдавецкім фронце мы маем крутыя зрухі ў справе барацьбы з ідэалёгічна-шкоднымі плынямі за пралетарскі зьмест кніжнай прадукцыі.

Відавочна, што гэтыя посьпехі магчыма было дасягнуць толькі дзякуючы НЯЎХІЛЬНАМУ ПРАВЯДЗЕНЬНЮ ЛЕНІНСКІХ ПРЫНЦЫПАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, ДЗЯКУЮЧЫ БАЛЬШАВІЦКАМУ КІРАЎНІЦТВУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ЯКАЯ ВЯЛА І ВЯДЗЕ НЕПРЫМІРЫМУЮ БАРАЦЬБУ З РОЗНАГА РОДУ БУРЖУАЗНЫМІ НАЦЫЯЛІСТЫЧНЫМІ ПЛЫНЯМІ І У ПЕРШУЮ ЧАРГУ З ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫМ ШАВІНІЗМАМ—ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, З КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМАМ, З ШАВІНІЗМАМІ УСІХ МАСЬЦЕЙ І АДЦЕНЬНЯЎ.

Захоўваючы такую непрымірымасьць да адхіленьняў ад ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні, мабілізуючы самыя шырокія масы працоўных для ўдзелу ў будаўніцтве пралетарскай культуры, мы забясьпечым поўную гегемонію пралетарскага зьместу ў культурным будаўніцтве.

Разгортваецца культурнае будаўніцтва працоўных нацменшасьцяй

У выніку настойлівага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі мы дасягнулі значнага ўздыму матар'яльнага становішча і культурнага ўзроўню працоўных мас БССР, якія пад кіраўніцтвам партыі, пры брацкай дапамозе рабочай класы ўсяго Саюзу, забясьпечылі шырокае разгортваньне будаўніцтва БССР.

За перыяд пасьля Кастрычніка гігантскі вырасла наша індустрыя і сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, значна ўзрасла колькасьць рабочай класы, шырока разгарнулася сетка культурных устаноў на роднай мове розных нацыянальнасьцяй: школы, лікпункты, клюбы, тэатры, сярэднія навучальныя ўстановы і г. д.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ па ўсіх франтох выкідае шалёнае супраціўленьне аджываючай класы, абвастрае клясавую барацьбу ў краіне.

Клясавая барацьба мае свой поўны адбітак і на ідэалёгічным фронце па ўсіх галінах культурнага будаўніцтва.

Клясавы вораг — кулак, ксёндз, рабін, сэктанты, нацыянал-дэмакратычныя і шавіністычныя элемэнты — стараюцца насеяць сярод працоўных мас нацменшасьцяй нацыянальную варожасьць, прапагандаваць контр-рэвалюцыйныя лёзунгі «нацыянальнага адзінства», атручваць працоўных антысэмітызмам і шавінізмамі.

Разгортваючы непрымірымую барацьбу з усякага роду варожымі нацыяналістычнымі плынямі і тэорыямі, партыя забясьпечыла сапраўдны росквіт пралетарскай культуры на мовах нацыянальных меншасьцяй.

Агульны лік устаноў і аддзяленьняў пры беларускіх навучальных установах па лініі сацыяльнага выхаваньня, прафтэхасьветы, педагагічнай асьветы вырас за апошнія 3 гады па ўстановах на яўрэйскай мове на 25 проц. (у 1927-28 годзе было 260 устаноў, у 1930-31 годзе—352), на польскай мове—на 29 проц. (у 1927-28 годзе было 171 установа, у 1930-1931 годзе—222).

За апошнія гады значна пашырана сетка 4-годак і 7-годак, якія працуюць на мовах нацменшасьцяй. На сёньня існуе 481 школа чатырохгодка, 112 семігодак, 5 школ калгаснай моладзі, 46 дзіцячых садоў.

ПАЛЕПШЫЛАСЯ МАТАР'ЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА культурна - асьветных устаноў на нацмовах (абсталяваньне памяшканьняў), паляпшаецца сацыяльны склад вучняў і матар'яльнае іх забясьпеченьне.

Найлепш забясьпечаным школьнай сеткай на чатырохгодках зьяўляецца працоўнае насельніцтва польскай нацыянальнасьці, удзельная вага якіх складае 13,3 проц., пры ўдзельнай вазе насельніцтва ў 2 проц. Па сямігодках дзеці яўрэйскай нацыянальнасьці забясьпечаны сеткай на 20,1 проц., пры ўдзельнай вазе насельніцтва 8,2 проц.

У справе ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных нацменшасьцяй мы маем таксама значныя посьпехі. Згодна перапісу 1926 году сярэдні ўзровень пісьменнасьці сярод нацменшасьцяй быў вышэй сярэдняга ўзроўню па БССР. Па пісьменнасьці на першым месцы ідуць латышы—57 проц., яўрэі—74 проц., літоўцы, немцы, татары—60 проц., палякі —57 проц. Дзякуючы шырока разгорнутай рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод нацменшасьцяй, у апошнія гады сярэдні процант пісьменнасьці даведзен да 70.

Палітасьветработа сярод нацменшасьцяй усё яшчэ зьяўляецца найбольш слабым месцам як па лініі нарасьветы, так і па лініі прафсаюзнай і інш. Гэта галіна работы сярод нацменшасьцяй усё яшчэ разгорнута слаба.

НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КЛЮБАЎ ЁСЬЦЬ: яўрэйскіх — 2, польскіх — 2, латыскіх —2 і літоўскіх—2 чырвоныя куткі.

Абслугоўваньне нацменшасьцяй рабочымі клюбамі прафсаюзаў па роднай мове, нават і там, дзе нацменшасьці складаюць значную колькасьць членаў саюзу, невыстарчальнае. У клюбных бібліятэках ёсьць яўрэйскіх кніг 4,2 проц., польскіх —0,7 проц., іншых нацыянальнасьцяй —0,5 проц. Ёсьць дзьве яўрэйскія бібліятэкі і нацыянальныя аддзяленьні пры агульных бібліятэках як польскіх, так і яўрэйскіх, але трэба адзначыць, што апошнія невыстарчальна забясьпечаны літаратурай на мовах нацменшасьцяй, частка літаратуры паштарэла, а папаўненьне новай літаратурай праходзіць слаба.

РАЗГОРТВАЕЦЦА СЕТКА ВЯЧЭРНІХ ШКОЛ розных тыпаў для рабочых-калгасьнікаў на родных мовах, але трэба адзначыць, што лік іх зьяўляецца яшчэ невыстарчальным.

Асабліва значных посьпехаў мы дабіліся ў галіне друку і выдавецкай работы. У БССР выдаюцца 3 яўрэйскія газэты, з іх 2 юнацкія, 1 польская газэта і 1 літоўская; латыскія газэты распаўсюджваюцца ў ліку 1.200 экз. У параўнаньні з мінулым мы маем вялікі рост тыражу іх. Так «Орка» з 1.000 экз. у 1926 г. вырасла да 6.000 экз. у 1930 г. Рост тыражоў—гэта адзін з паказальнікаў росту палітычнай сьвядомасьці працоўных мас нацменшасьцяй. Аб гэтым-жа гаворыць пашырэньне выдавецкай справы.

У выніку разгортваньня нацмэнаўскай работы ў галіне мастацтва мы маем на сёньнішні дзень 3 яўрэйскія тэатры, з іх 1 вандроўны, 1 польскі вандроўны тэатр. Існуе дзяржаўная капэла на яўрэйскай мове.

ЗНАЧНА ПАШЫРАНА РАБОТА па падрыхтоўцы нацмэнаўскіх кадраў.

Налічваецца 2 яўрэйскіх і 1 польскага пэдтэхнікумаў, яўрэйскага аддзяленьня і польскай катэдры на пэдфаку БДУ, яўрэйскага і польскага аддзяленьня пры Магілеўскім палітасьветтэхнікуме, 6 вячэрніх і 2 дзённых рабфакаў і цэлага раду іншых устаноў з найвялікшай выразнасьцю паказваюць нашы посьпехі ў гэтай галіне.

Посьпехі здабыты рабочай клясай пад кіраўніцтвам нашай партыі ў жорсткіх баёх з клясавым ворагам усіх масьцей і адценьняў.

Партыя змагла дабіцца рашаючых перамог у справе ажыцьцяўленьня нацпалітыкі, у тым ліку і ў галіне культурнага будаўніцтва сярод нацменшасьцяй таму, што настойліва ажыцьцяўляла ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі, непрымірыма змагалася з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, нанесла руйнуючы ўдар па контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызьме, упарта перамагала праяўленьні ўсіх іншых шавінізмаў.

ВАЙНЭОЛЬ.
ЗАРЭМБСКІ.

Новыя тысячы працоўных становяцца пісьменнымі

X ўсебеларускі зьезд саветаў пацьвердзіў пастанову прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР аб поўнай і канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўнага насельніцтва да ўзросьце да 45 год на працягу 1932 г.

Сучаснае становішча работы па ліквідацыі няпісьменнасьці гаворыць аб значных дасягненьнях у справе колькаснага ахопу насельніцтва лікпунктамі і пасьпяховага навучаньня. Паводле даных раёнаў усяго ўлічана няпісьменнага насельніцтва ва ўзросьце да 45 год 461.837 чалавек, з іх ахоплена навучаньнем 330.190 чалавек, што складае 71,5 проц. Ёсьць рад раёнаў, якія шляхам энэргічнай работы дабіліся 100-проц. ахопу лікпунктамі няпісьменнага працоўнага насельніцтва.

Можна прывесьці шмат фактаў аб тым, як лікпункты ўплываюць на адносіны працоўнага сялянства, якое ў іх навучаецца, да пытаньняў калгаснага будаўніцтва, як лікпункты праводзяць гаспадарча-палітычныя кампаніі і дасягаюць у гэтым вялізарных посьпехаў. Так, беднякі і сераднякі, якія ліквідуюць сваю няпісьменнасьць у Веранцоўскім сельсавеце (Кохануўскі раён), разам са сваімі сем'ямі ўступілі ў калгас, аграмадзілі сродкі вытворчасьці і г. д.

Аднак, побач з фактамі, якія сьведчаць аб посьпехах у справе ліквідацыі няпісьменнасьці, усё-ж у асобных раёнах ёсьць недаацэнка палітычнага значэньня гэтай работы. У гэтым сэнсе характэрна, што, напрыклад, у Шклоўскім раёне навучаньнем ахоплена ўсяго 49,8 проц. няпісьменных. Аб недаацэнцы палітычнага значэньня работы па ліквідацыі няпісьменнасьці гаворыць і тое, што ў некаторых буйных прамысловых цэнтрах (Гомсель) процант ахопу лікпунктамі няпісьменных меншы, чым у вясковых раёнах.

Да недахопу ў рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці трэба аднесьці і тое, што ў значнай частцы лікпунктаў да гэтага часу ня ўведзены палітграмадзіны, што не дае магчымасьці працоўным, якія навучаюцца ў лікпунктах, адначасова з навучаньнем павышаць сваю кваліфікацыю. Да рэчы трэба адзначыць, што інтэрнацыянальна-клясавае і антырэлігійнае выхаваньне не знайшло шырокага распаўсюджаньня ў рабоце лікпунктаў.

Савецкая грамадзкасьць не ў выстарчальнай меры мабілізавалася на дапамогу культурна-асьветным органам у справе выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных.

Калегія НКА прывяла пастанову аб тым, каб з 25-га красавіка да 1-га мая правесьці ў лікпунктах, якія скончылі прапрацоўку праграмы, падагульвальныя заняткі і ў часе першамайскіх сьвят зрабіць выпускі.

Органы нарасьветы і таварыства «ПК» бальшавіцкімі тэмпамі работы разам з працоўнай грамадзкасьцю, камсамольскімі, прафсаюзнымі і іншымі арганізацыямі павінны ліквідаваць недахопы і прарывы, якія мы маем у справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Першамайскія сьвяты павінны быць максымальна скарыстаны для яшчэ большай мабілізацыі грамадзкасьці на дапамогу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Кожны пісьменны працоўны павінен выканаць свой грамадзкі абавязак перад пралетарскай дыяржавай—навучыць грамаце пя менш аднаго няпісьменнага.

АРЛОЎСКІ.

Перадавыя ўдарнікі ўліваюцца ў сталёвыя рады бальшавіцкай партыі

Камунараўцы сваіх перадавых ударнікаў перадаюць у КП(б)Б

РАБОЧЫЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА МАШЫНА - БУДАЎНІЧАГА ЗАВОДУ «КАМУНАР» У СУВЯЗІ З НАДЫХОДАМ ПЕРШАМАЙСКІХ СЬВЯТ І ДРУГОЙ ГАДАВІНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА РАЗГАРНУЛІ ЭНЭРГІЧНУЮ РАБОТУ ПА ЎЗМАЦНЕНЬНІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАНЬНЯ, ПА АРГАНІЗАЦЫІ НОВЫХ ЎДАРНЫХ БРЫГАД, ПА ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫЯРЖАВАЙ І СУСЬВЕТНЫМ ПРАЛЕТАРЫЯТАМ.

РАБОЧЫЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА ЗАВОДУ 1 МАЯ—ДЗЕНЬ АГЛЯДУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ СІЛ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ГАДАВІНУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА—СУСТРАКАЮЦЬ НОВЫМ ТВОРЧЫМ УЗДЫМАМ, БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ СВОЙ СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНІЛЯН.

У АДЗНАКУ СВАЁЙ АДДАНАСЬЦІ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ, ЯЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ, У АДЗНАКУ НЕПАХІСНАЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ЗМАГАЦЦА З ВОРАГАМІ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫЯРЖАВЫ, З УСЯКІМІ ЎХІЛІСТАМІ АД ЛЕНІНСКАЙ ЛІНІІ — РАБОЧЫЯ - ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНІКІ ЛЕПШЫХ ЎДАРНІКАЎ ПЕРАДАЮЦЬ У РАДЫ ПАРТЫІ ЛЕНІНА.

АДЗІН З ЛЕПШЫХ ПОХАЎ — СЬЛЯСАРНЫ — ПЕРАДАЎ 9 РАБОЧЫХ ЎДАРНІКАЎ У КП(б)Б. ПА ЎСІМ ЗАВОДЗЕ ПАДАНА РАБОЧЫМІ 19 ЗАЯЎ.

Тав. ЛУЗГІН — рабочы заводу імя Варашыпава — падаў заяву аб уступленьні ў партыю

У рады ленінскай партыі

Другую гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва і першамайскія сьвяты рабочыя **друкарні імя Сталіна** сустракаюць павышэньнем сваёй актыўнасьці ў змаганьні за выкананьне прамфінпляну. Гэтымі днямі ў друкарні адбыўся зьлёт ударнікаў, па якім дзесяткі рабочых уступілі ў новыя ўдарныя брыгады імя «518» і «1040».

На зьлёце ўдарнікаў 10 найбольш старых перадавых рабочых, якія з першага дня разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва сталі ў рады змагароў за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за ўздым прадукцыйнасьці працы—падалі калектыўную заяву аб сваім уступленьні ў ленінскую партыю.

Уступіўшыя ў партыю на зьлёце ўдарнікаў зьвярнуліся з заклікам да ўсіх рабочых сустрэць трэці год сацыялістычнага спаборніцтва ўзмоцненай барацьбой за выкананьне якасных паказальнікаў.

Сярод рабочых друкарні разгорнута шырокая масавая работа ў сувязі з першамайскімі сьвятамі. На 28 красавіка рабочымі - ударнікамі падана 17 заяў аб уступленьні ў партыю.

* * *

На чырвонасьцяжным заводзе імя Варашылава 22 рабочыя-ўдарнікі падалі заявы аб уступленьні ў ленінскую партыю.

* * *

На заводзе «Дрэвапрацоўшчык» дзесяткі рабочых ударнікаў заявілі аб сваім уступленьні ў КП(б)Б.

Сяргей Дарожны

ВОЛЬНЫ ЛІСТ ЗЬНЯВОЛЕНАМУ БРАТУ

«Дарагі таварыш! Учора толькі скончылася наша барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць з фашысцка - вастрожнай адміністрацыяй. Скончылася наша сямідзённая галадоўка. Яшчэ сілы слабыя, але пішу, паведамляю цябе аб цяперашнім нашым становішчы». (Вільня, «Стэфанаўка». Палітвязень Д.).

—Таварыш, змаганьне—яно будзе жыць,
З-пад шыбеніц Львову,
З каменных прарэшын,
Помста ўзьнімаецца,
Пошчакам дрыжыць.

Ты верыш у моц
Наплываючай хвалі,
Ты чуш, як будуем мы
Распубліку сваю.
І ты запяваеш: ...працяцьцем пятаўны...

З-за сьцен падтрымваюць
Песьню тваю.

Бо ходзіць над Вільняй,
Гучыць па-над Луцкам
Замучаных цяжкай няволяй хада,
Бо сочыцца кроў
На зямлі Навагрудзкай,
Бо крык забаронен штыхамі салдат.

Над Менскам сягоньнячы
Дыхае травень,
На вуліцу ідуць мае таварышы.
У іхніх вачох—
Веснавая рухавасьць,
Сусьветная рэвалюцыя
І шчырасьць душы...

Брат мой, далёкі,
Замучаны вязень!
Ад сэрца ідзе гэтай песьні радно.

Мы славім гэроаў паўстаўшае клясы,
Мы помнім эдданых ёй,
Лепшых сынаў!

Чорт пабяры вас,
Буржуйскае кодла!
Чорная зграя цыліндраў і шпор.
Катуйце,
Сьпявайце фашысцкія модлы,
Каб ўціхамірыўся рэвалюцыі віхор.

Шомпалам, крыжам...
На славу айчыне!
На славу, прадажны фашысцкі танок...
У гэтай айчыны—
Турма прад вачыма,
У гэтай айчыны —
Паўстанцкі зарок!

Яе ня суцішаць
Ні крыж, ні вастрогі,
Узброеныя па вушы дазорцы і шпікі!
Вогнішча рэвалюцыі
Распаліваюць стогны,
І гэтага вогнішча
Ня стрымаюць штыхі!

Я ня ведаю, як цябе клічуць,
Брат мой далёкі,
Зьняволены брат!
Я чую, як сэрца тваё
Удары лічыць,
Як цісьне і душыць
Глухі казэмат.

Ты хочаш падняцца
І здраджваюць сілы,
Ты хочаш ім плюнуць
Крывёю у твар...
І вусны здранцьвелі...
І рукі скруцілі...
І хмурны за сьценкаю
Ходзіць жандар.

Ён добра нясе
Сваю службу сабачую.
Нюх—дасканалы,
Вусы—да грудзей...
Пудалу такому
Далі ў прыдачу
Мэдаль за выслугі,
За зьдзекі з людзей.

Я знаю, ня лёгка
У засьценку, мой браце!
Твой ліст нечаканы
І я прачытаў.
Ты пішаш:—цесна рэвалюцыі ў казэмаце,
Але расьце яе вопатны стан.

Ты пішаш,
На сёмыя суткі ня еўшы:

Тав. ДРАГУН — рабочы заводу імя Варашылава — падаў заяву аб уступленьні ў партыю

„У Варшаве гарантаваны поўны супакой"

Пад такім загалоўкам уся фашысцкая прэса Польшчы паведамляе за некалькі дзён да 1-га мая аб мерапрыемствах паліцэйскіх улад у сувязі з надыходзячым днём 1-га мая.

«У Варшаве будзе захаваны поўны супакой і парадак»—усьцяж цьвердзяць буржуазныя газэты.

«Ва ўсёй краіне—спакойна і ціха». «Камуністы ўсюды пацярпелі паражэньне». «Камуністы ня маюць ніякага ўплыву на масы»,—так будуць паведамляць фашысцкія і сацыял - фашысцкія газэты ў сваіх вячэрніх выданьнях у дзень 1-га мая і раніцных выданьнях 2-га мая.

Ці-ж так ужо спакойна ў сапраўднасьці ў тэй краіне, чыя прэса так узмоцнена стараецца пераканаць у тым, што 1-га мая будзе гарантаваны поўны супакой? Ці сапраўды камуністы ня маюць ніякага ўплыву на масы, а фашысцкая дыктатура Пілсудзкага, апіраючыся на сымпатыі ўсяго народу, спакойна кіруе краінай?

На гэта пытаньне дае адказ сама-ж фашысцкая прэса. На гэта пытаньне найбольш красамоўна адказвае афіцыяльны камунікат урадавага камісара Варшавы аб тых папярэдніх мерапрыемствах, якія прыняты фашысцкай паліцыяй для таго, каб не дапусьціць першамайскіх дэманстрацый.

Паслухайце, таварышы, які плян намечан варшаўскай паліцыяй да дня 1-га мая. Ці-ж гэта падобна на тое, што ў краіне ўсё так вельмі спакойна? Ці-ж гэта падобна на тое, што камуністы ня маюць ніякіх сіл у масах?

Слухайце.

Афіцыяльны камунікат, зьмешчаны ў «Газэце Польскай», паведамляе аб тым, што ў Варшаве створан спэцыяльны штаб на чале з заводай Яраш эвічам, які будзе кіраваць у дзень 1-га мая дзеяньнямі паліцыі.

Гэты-ж камунікат паведамляе аб тым, што ў Варшаве ўводзіцца стан аблогі, пачынаючы з 6 гадз. увечары 30-га красавіка да 8 гадз. раніцы 2-га мая.

Гэты-ж камунікат паведамляе аб тым, што ў распараджэньні спэцыяльнага створанага штабу будуць знаходзіцца наступныя ўзброеныя сілы:

2.500 паліцэйскіх;

паліцэйскія будуць забясьпечаны сталёвымі каскамі, газавымі маскамі і газавымі бомбамі;

2 кавалерыйскія эскадроны паліцыі і ў рэзэрве атрад пешай паліцыі;

35 грузавых паліцэйскіх аўтамабіляў, вызначаных для шваркай перакідкі паліцэйскіх атрадаў у розныя часткі гораду;

15 матацыклаў, на кожным з іх па 3 паліцэйскія;

2 новыя бранявыя аўтамабілі, узброеныя кулямётамі;

100 паліцэйскіх афіцэраў, якія будуць над кіраўніцтвам штаба кіраваць баявымі дзеяньнямі паліцыі;

«і так далей», як паведамляе гэты-ж камунікат.

«У краіне ўсё спакойна», камуністы «траціць уплыў у масах» і супроць першамайскіх рабочых дэманстрацый у адным толькі горадзе Варшаве мабілізуюцца вялізарнейшыя ўзброеныя сілы паліцыі, якія павінны зброяй, газамі, бранявымі аўтамабілямі, кулямётамі зьнішчыць дэманстрантаў.

Гэты сьпіс сіл, якія мабілізуюць варшаўскія ўлады да дня 1-га мая, лепш за ўсё зрывае з буржуазнай прэсы маску прыемнай ўхмылкі, з якой яна паведамляе аб тым, што ў дзень 1-га мая будзе гарантаваны спакой і з якой яна будзе паведамляць аб тым, што «асобныя выступленьні камуністаў хутка ліквідаваліся паліцыяй».

Супроць каго мабілізуецца фашызм у гэты дзень—дзень міжнароднага пралетарыяту?

Цытаваны намі вышэй камунікат паведамляе:

«Небясьпека парушэньня супакою і парадку пагражае, уласна гаворачы, толькі з боку камуністаў, якія, ня гледзячы на ўсе паражэньні панесеныя імі за апошнія некалькі тыдняў у выніку шматлікіх арыштаў і ліквідацыі камуністычных саюзаў, будуць імкнуцца па прыкладзе мінулых год выклікаць беспарадкі і вострыя сутычкі».

Дык вось супроць каго накіраваны ўсе гэтыя шматлікія сілы фашысцкай паліцыі. Дык вось як у сапраўднасьці выглядае «слабасьць» камуністычнай партыі, супроць якой у адным толькі горадзе трэба мабілізаваць тысячы паліцэйскіх, бранявыя аўтамабілі, кулямёты, газы і другія прылады сьмерці і тэрору.

Не! Толькі ва ўмовах найвялікшага нездавальненьня мас, толькі ў абставінах, калі камуністычная партыя зьяўляецца партыяй самых шырокіх мас рабочай клясы, толькі ва ўмовах, калі хваля рэвалюцыйнага ўздыму расьце з нястрымнай сілай, буржуазія прымушана хапацца за такія сродкі, якія, паводле яе плянаў, павінны зрываць першамайскія выступленьні і заліваць іх у патоках крыві.

Відаць, у краіне вельмі і вельмі неспакойна, відаць, у сталіцы дзяржавы вельмі і вельмі многа выбуховай матэрыі, калі трэба ўжываць такія крокі, аб якіх з цынічнай шчырасьцю і адначасова з ледзь угойвеэмым перапалохам паведамляе папючая фашысцкая зграя па старонках сваіх газэт, крокі, што мяжуюцца з мэтадамі грамадзянскай вайны.

Відаць, неспакойна ў краіне, дзе на ля мільёнаў беспрацоўных. Відаць, ня зусім спакойна ў сталіцы Польшчы, што напоўнена дзесяткамі тысяч галодных пралетараў, якія ўсё больш згуртавана арганізуюцца вакол сваёй камуністычнай арганізацыі, калі супроць першамайскіх дэманстрацый трэба выводзіць бранявыя машыны, кулямёты і газы.

Гэты-ж камунікат прымушан паведаміць аб тым, што ў дзень 1-га мая ня будуць працаваць буйнейшыя фабрыкі і прадпрыемствы Варшавы, як, напрыклад, «дзяржаўная фабрыка зброі», буйная мэталюргічная фабрыка «Ліль-попа», «Порбэна» і г. д. Усё гэта — буйнейшыя фабрычныя цэнтры Варшавы і адначасова апорныя пункты гэрэічнага варшаўскага рэвалюцыйнага пралетарыяту. Ня зусім спакойна ў сталіцы, калі загадзя газэты прымушаны паведамляць аб тым, што самыя буйныя фабрыкі гораду, ды яшчэ ў дадатак фабрыкі ваеннай прамысловасьці, у дзень 1-га мая абвяшчаюць палітычную забастоўку і рыхтуюцца да рэвалюцыйных дэманстрацый.

Яшчэ адна характэрная дэталь. Камунікат паведамляе, што трамваі і аўтобусы выйдуць у горад толькі пасьля 3-х гадзін дня 1-га мая. Робіцца гэта для таго, каб, як скромна паведамляе камунікат, «гарадзкая маемасьць не пацярпела страты». Аб якіх стратах ідзе гутарка? Гутарка ідзе пра боязнь вялікіх рэвалюцыйных дэманстрацый—гэта раз. І два — гэта тое, што рэвалюцыйныя рабочыя варшаўскіх трамваяў самі ў гэты дзень далучаюцца да радоў дэманструючых пралетараў.

Дзень 1-га мая будзе для пралетараў Варшавы і пралетараў усёй Польшчы днём баявых дэманстрацый, днём, калі маса, памаючы ўсе самыя жорсткія перашкоды белага тэрору, будзе дэманстраваць пад сьцягамі камуністычнай партыі. Новыя ахвяры; кроў, вылітая ў гэты дзень ня толькі не аслабіць сіл рэвалюцыйнага пралетарыяту Польшчы, але яшчэ больш іх сцэмантуе, яшчэ больш іх узмоцніць для далейшых клясавых баёў.

Ленін калісь пісаў:

«У эксплёататараў ёсьць яшчэ даволі сіл у руках, каб абавіваць і лінчаваць лепшых правадыроў сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, каб паглыбляць ахвяры і пакуты рабочых у акупаваных ці захопленых імі краінах, ці заваяваных імі абласьцёх. Але ў эксплёататараў усяго сьвету ня хопіць сіл, каб затрымаць перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, што нясе вызваленьне чалавецтву ад ярма капіталу, ад вечнай пагрозы новых і нямінучых пры капіталізьме імпэрыялістычных войн».

Польскі фашызм можа яшчэ забіваць і расстрэльваць лепшых пралетараў Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны. Польскі фашызм можа яшчэ кідаць супроць першамайскіх дэманстрацый паліцэйскія сілы, бранявікі і кулямёты. Але польскаму фашызму ня ўдасца рэвалюцыйнага руху мільённых мас. Пануючай дыктатуры буржуазіі ня ўдасца ўсё-ж затрымаць перамогу начак, перамогу пралетарскай рэвалюцыі.

Дэманструючы тут, у вольных умовах, вольнай Савецкай краіны, мы ў дзень 1-га мая кідаем праз межы нашы гарачы заклік:

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба міжнароднага пралетарыяту!

Няхай жывуць рабочыя і працоўныя масы Польшчы і іх правадыр—КПП.

Няхай жывуць гэраічныя пралетары Варшавы і іх слаўная варшаўская камуністычная арганізацыя!

А. АЛЬШЭЎСКІ.

...ацнее калгасная Беларусь

200.000 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР сустракаюць 42-ю баявую пралетарскую маёўку, аб'яднаўшыся ў калгасы

Першамайскія дні—

ДНІ ЎДАРНАЙ СЯЎБЫ

З году ў год усё больш і больш нарастаюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР — краіне пралетарскай дыктатуры. З посьпехам вырашаецца задача індустрыялізацыі краіны, што з кожным днём пашырае і ўзмацняе асновы ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Пралетарыят БССР пад кіраўніцтвам свайго авангарду КП(б)Б і яе левінскага ЦК прыходзіць да 42-ой баявой пралетарскай маёўкі, да першамайскіх сьвят з вялізарнымі практычнымі вынікамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Шырыцца і ўсё больш мацнее база сацыялізму ня толькі ў прамысловасьці, але і сельскай гаспадарцы. Расьце армія актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва барацьбітоў за сацыялізм. Пашыраецца і мацнее асноўная і галоўная апора партыі і ўлады ў вёсцы—рады калгасьнікаў.

Бядняцка-серадняцкія масы, у выніку правільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, дзесяткамі і сотнямі тысяч пераходзяць на шлях калектывізацыі, на шлях сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваючы суцэльную калектывізацыю і на гэтай аснове практычна ліквідуючы свайго клясавага ворага—кулацтва як клясу.

Толькі за апошні год дасягнуты вялізарныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. За час ад 1-га мая 1931 г. па 1-е мая 1931 г. **ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ КОЛЬКАСЬЦЬ КАЛГАСАЎ З 3.021 ДА 6.400, А ЛІК КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫХ ГАСПАДАРАК — З 87.200 ДА 200.000.**

26 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 30 проц. пасеўнай плошчы ўжо аб'яднаны ў калектыўныя гаспадаркі.

152.000 абагуленых рабочых коняй, 294.000 абагуленых кароў, 236.000 сьвіней, 30 машынатрактарных станцый — вось асноўныя вынікі, з якімі калгасы БССР прыходзяць да першамайскіх сьвят.

Калгасы шырока выкарыстоўваюць лепшыя формы і мэтады арганізацыі вытворчасьці. **ШЫРОКА УКАРАНЯЕЦЦА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА, 3.100 КАЛГАСАЎ УЖО ПРАВОДЗЯЦЬ РАБОТУ НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬНЫХ НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ.**

Калгасы першымі выйшлі ў поле і распачалі другую бальшавіцкую сяўбу.

Прарывы, якія ёсьць у падрыхтоўцы да сяўбы, будуць на-ходу выпраўлены—праграма другой бальшавіцкай вясны калгасамі БССР будзе выкапана.

Мы правядзем веснавую сяўбу пад лёзунгам магутнага прыліву ў калгасы сёнешніх аднаасобнікаў. Калгасы зробяць усё неабходнае, каб хутчэй пераканаць сёнешніх аднаасобнікаў у неабходнасьці хутчэйшага пераходу на шлях калектывізацыі.

Калгасы праводзяць зараз вялікую работу па спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі, па арганізацыі сацыялістычных фабрык сырцу, мяса і малочных прадуктаў. **УЖО АРГАНІЗАВАНА 645 МАЛОЧНА-ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ І 872 СЬВІНАГАДОЎЧЫЯ ТАВАРНЫЯ ФЭРМЫ.** На працягу апошняй зімы падрыхтавана звыш 9.000 калгасьнікаў для арганізацыі і вядзеньня калектыўнай вытворчасьці.

Нашы посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва выклікаюць шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў як унутры нашай краіны, так і з боку сусьветнай буржуазіі. Сусьветны капіталізм, які корчыцца ў ціскох усё ўзрастаючага эканамічнага крызісу, усімі сіламі і сродкамі стараецца перашкодзіць і сарваць будаўніцтва сацыялізму.

Першае мая калгасная маса будзе праводзіць пад лёзунгам ня толькі барацьбы за пашырэньне калгасных раёў, за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы, а і пад лёзунгам узмацненьня абароназдольнасьці нашай пралетарскай краіны.

Калгасная маса зьяўляецца і будзе зьяўляецца надзейнай, моцнай, асноўнай і галоўнай апорай камуністычнай партыі і ўлады на вёсцы, ня толькі ў будаўніцтве сацыялізму, але і ў адкрытых баёх з сусьветнай буржуазіяй.

Веснавая сяўба патрабуе баявых тэмпаў. Бальшавіцкім правядзеньнем веснавой сяўбы і своячасовай уборкай ураджаю забясьпечым краіну харчамі і сырцом у трэцім годзе пяцігодкі.

За бальшавіцкія тэмпы, за ліквідацыю кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі. За пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі!

Калгасьнікі, бяднякі і сераднякі — аднаасобнікі, цясьней вакол КП(б)Б за генэральную лінію партыі, за перамогу сацыялізму!

КАЛГАСЦЭНТР БССР.

У барацьбе за 30 проц.

«Цяпер мы ўжо не адны, кваліфікаваныя бальшавікі, а самі сяляне з калгасьнікаў, дзесяткі тысяч сялян — арганізатараў і агітатараў калгаснай справы будуць несьці наперад сьцяг калектывізацыі».

Гэтыя словы т. Сталіна з усёй выразнасьцю пацьвярджаюцца практыкай разгортваньня калгаснага будаўніцтва ў БССР.

За студзень месяц г.г. у калгасы БССР уступіла 8.878 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, за люты — 15.679, за сакавік—23.285 і за дзьве дэкады красавіка — 22.989 гаспадарак. Такім чынам, мы за адзначаны пэрыяд часу мелі няўхільнае нарастаньне тэмпаў калгаснага руху.

На 20 красавіка 25 раёнаў БССР выканалі дырэктыву студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі да вясны 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Лепельскі раён калектывізаваў ужо па 54,5 проц., Клімавіцкі — па 52,9 проц., Крычаўскі — па 43,6 проц., Бягомльскі — па 43,2 проц., Хоцімскі—на 45,8 проц., Менскі — на 40,9 проц. і г. д.

Практыка паказвае, што там, дзе не спадзяваліся на самацёк, а сталі на чале калгаснага прыліву і гаспадарча замацоўвалі калгасы, дзе былі скарыстаны розпастайныя формы і мэтады вярбоўкі аднаасобнікаў, дзе давалі сапраўды рашучы адпор кулаку — дасягнуты дадатнія вынікі.

Толькі за час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і калгасаў у калгасы ўступіла 36.862 гаспадаркі і арганізаваны 1.162 новыя калгасы. Паказ аднагадовай практыкі калгасаў на справе пераканаў аднаасобніка—бедняка і серадняка ў перавазе калектыўнай гаспадаркі.

Шырокая кампанія, праведзеная па ініцыятыве калгасу **«АВАНГАРД», Смалявіцкага** раёну, па арганізацыі сталінскага прызыву ў калгасы, за дзьве дэкады дала 12.130 новых калгасных гаспадарак і 411 новых калгасаў.

Беднякі і сераднякі пасёлку **ЯНКАЎЛОЖАН**, Рагачоўскага раёну, у часе сталінскага прызыву, уступаючы ў калгас, заявілі ўсім вёскам:

«Мы ня можам стаяць у баку ад вялікай сацыялістычнай будоўлі. На заліку партыі мы ўключаемся на новыя ...рэйкі, на рэйкі сацыялістычнага будаўніцтва».

У часе самамабілізацыі дэлегатаў рэйных зьездаў калгасаў для вярбоўкі новых калгасьнікаў па **Талочынскім** раёне за 3 дні арганізавалася 5 новых калгасаў, а за дэкаду арганізавана 14 калгасаў. У **Крычаўскім** раёне — 11 калгасаў, **Смалявіцкім** — 6, **Заспаўскім** — 6, **Полацкім**—12, **Рагачоўскім**—12, **Мсьціслаўскім** — 8 і г. д.

Шырокая папулярызацыя пастаноў 6-га зьезду саветаў СССР і 3-га Усебеларускага зьезду калгасаў выклікала таксама новы магутны прыліў у калгасы. Напрыклад, у Талочынскім раёне пастановы 6-га Усесаюзнага зьезду саветаў і тэзісы тав. Якаўлева былі абгавораны ў 30 вёсках, а пастановы 6-га зьезду саветаў СССР і 3-га зьезду калгасаў БССР — у 130 населішчах. У выніку за 5 дзён красавіка па раёне арганізавана 7 новых калгасаў. У **Крупскім** раёне за 7 дзён красавіка арганізавана 14 новых калгасаў.

Асаблівай увагі заслугоўвае вярбоўчая камісія калгасу **«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»** Крупскага раёну, якая, пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б, за 5 дзён красавіка арганізавала 4 калгасы ў вёсках: **Старая Слабада, Сормы, Сьвірыдаўка і Машчаніцы.** Процант калектывізацыі ў гэтым сельсавеце, дзе знаходзіцца калгас «Савецкая Беларусь», за адзін месяц павялічыўся з 5 да 30.

Папуляризацыя пастаноў зьездаў сярод аднаасобнікаў падвоіла тэмпы калектывізацыі. Калі за аднолькавую дэкаду сакавіка ў калгасы ўступіла 8.047 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, дык за першую дэкаду красавіка — 14.338 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Практыка і работа ініцыятыўных груп цалкам сабе апраўдала. Там, дзе былі складзены ініцыятыўныя групы і дзе вялася з імі работа, яны перарасьлі і перарастаюць у калгасы. **У б. Астрашыцка-Гарадзецкім раёне за месяц перад ліквідацыяй яго 10 ініцыятыўных груп перарасьлі ў калгас.** У Горацкім раёне за сьнежань месяц перарасьлі ў калгасы 7 ініцыятыўных груп. У Малевіцкім сельсавеце дзьве ініцыятыўныя групы, якія былі арганізаваны вярбоўшчыкамі з калгасу «Чырвоны партызан», за месяц перарасьлі ў калгасы.

Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

Акрамя ініцыятыўных груп, у многіх мясцох працуюць камісіі садзейнасьці калектывізацыі і вярбовачныя камісіі пры калгасах. Калгасьнікі-актывісты і мясцовы актыў вядуць масавую работу па ўцягненьні аднаасобнікаў у калгасы шляхам асабістага прыкладу і паказам калгасных дасягненьняў, узьлейнічаючы гэтым на беднякоў і сераднякоў, якія хістаюцца.

Вярбовачная камісія **калгасу імя Сталіна** (Талочынскі раён) правяла вялікую работу ў суседніх вёсках. Гэта камісія зрабіла 5 справаздач аб рабоце калгасу і аб выніках разьмеркаваньня ўраджаю. Гэта выклікала прыліў — **12 гаспадарак з вёскі Багрынава, 13 гаспадарак з в. Крывое, 21 гаспадарка з в. Сіньцава і 10 гаспадарак з хутара Замошша.** Гэты калгас дабіўся такіх вынікаў, дзякуючы разгортваньню масавай работы сярод аднаасобнікаў і наладжваньню добрасуседзкіх адносін з вакольнымі вёскамі. Калгас дапамагаў аднаасобнікам — беднякам і сераднякам машынамі, цягавай сілай, узяў шэфства над в. **Поўсьціхава**, дзе арганізаваў бібліятэку і праводзіў вялікую культурна-палітычную работу. Гэта вёска арганізавала таксама суботнік дапамогі калгасу ў часе ўборкі ўраджаю. **Зараз у Поўсьціхаве арганізован калгас «Ленінскі шлях», які аб'ядноўвае 21 бядняцка-серадняцкую гаспадарку.**

Батрачка-калгасьніца з калгасу імя Сталіна—**МАРЦІНКЕВІЧ** завербавала 4-х новых калгасьнікаў. У Лоеўскім раёне калгасьнікі-вярбоўшчыкі арганізавалі 12 ініцыятыўных груп, якія аб'ядноўваюць 158 гаспадарак. Арганізавалі 7 новых калгасаў і два ТСАЗ.

Ацэнка пленуму ЦК абгрунтавана і тым, што тэмпы калектывізацыі, якія зараз існуюць, яшчэ не забясьпечваюць выкананьня вызначаных студзеньскім пленумам ЦК заданьняў аб калектывізацыі 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да вясны бягучага году.

Правааппартуністычная практыка ў калгасным руху ў радзе раёнаў, самапёк і нежаданьне арганізаваць прыліў — зьяўляюцца асноўнай прычынай слабых тэмпаў калектывізацыі.

Гэта пацьвярджаецца і тым, што ёсьць такія раёны, як Ветрынскі і Юравіцкі, дзе за апошнія 2 месяцы (люты-сакавік) зусім няма росту калектывізацыі; зусім незначны рост за гэтыя 2 месяцы ў Гарадоцкім раёне — на 0,2 проц., Уваравіцкім — 0,4 проц., Гомельскім — 0,4, Дрыбінскім — 0,8, Буйдзенскім — 0,9.

За апошнюю дэкаду сакавіка зусім на было росту калектывізацыі — у Гомельскім, Мехаскім, Лёзьненскім, Сіроцінскім і Копыльскім раёнах.

У калгасе «Шлях да сацыялізму» (Лёзьненскі раён) дайшло да таго, што на сходах беднякі садзяцца з аднаго боку, а сераднякі—з другога. Праўленьне райкалгасаюзу не зварочвае на гэта ўвагі.

Некаторыя раёны аказаліся няздольнымі выкрыць маноўры кулака, мабілізаваць масы для таго, каб зламаць яго супраціўленьне і забясьпечыць баявы тэмп калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Мабілізацыя грамадзкасьці, папуляризацыя пастаноў VI зьезду саветаў, III зьезду калгасаў БССР, пастаноў красавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б сярод аднаасобнікаў і правядзеньне масавай работы сярод беднаты і батрацтва, рашучае змаганьне з кулацтвам і яго агентурай—правымі апартуністамі і «левымі» загібшчыкамі, арганізацыя ініцыятыўных груп і вярбовачных камісій, гаспадарчае і арганізацыйнае замацаваньне калгасаў, пераход іх на зьдзельшчыну — забясьпечаць выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі ў справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, у справе завяршэньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва, як клясы.

Дні міжнароднага пралетарскага сьвята — 1-га і 2-га мая ператворым у магутны першамайскі прыліў у калгасы. Намячэньне аб 30-ці процантнай калектывізацыі БССР да веснавой сяўбы можа і павінна быць выканана.

П. СКАВІНСКІ.

З пасеўнага фронту

КАПЫЛЬ. (Па тэлеграфу). Калгасы «Бальшавік», «Пахар» і імя Сталіна, Песачанскага сельсавету, 27-га красавіка пачалі веснавую сяўбу. Першы выхад у поле паказаў поўную падрыхтаванасьць калгасьнікаў. Уся работа пераведзена на зьдзельшчыну, выпічаную ў працаднёх.

Калгасьнікі запэўнілі партыю і ўрад, што з посьпехам правядуць бальшавіцкую сяўбу і будуць пільна сачыць за мяжой, ля якой яны працуюць.

***

КРЫЧАЎ. (Па тэлеграфу). Калгасы «Сталін», «1-га мая» і «Бальшавік» пачалі сяўбу на аснове зьдзельшчыны. У раёне абвешчан першамайскі заклік у калгасы.

***

НАРОЎЛЯ. (Па тэлеграфу). 10 калгасаў раёну ўжо пачалі палявыя работы. Ужо засеяна рознымі культурамі 250 гэкт. Не хапае насеньня бульбы і грубых кармоў.

***

КРУПКІ. (Па тэлеграфу). У калгасах пачалася сяўба. 90 проц. калгасаў пераведзены на зьдзельшчыну.

***

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Клімавіцкі раён прыступіў да сяўбы. Першымі пачалі палявыя работы калгасы імя Молатава, «Чырвоная горка» і «Рабочы».

***

ДРЫБІН. (Па тэлеграфу). Калгасы раёну арганізавана вышлі ў поле. У калгасныя брыгады ўліпося 12 аднаасобнікаў.

***

АСІПАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Першы пачаў сяўбу калгас «Сазнаньне». 27 красавіка выехалі ў поле калгасы «Бальшавік», «Шлях беднака», «Чырвоная [illegible] і Чырвоныя ўсходы». Ужо [illegible] правільнай арганізацыі працы і пераходу на зьдзельшчыну, у калгас «Чырвоныя ўсходы» ў часе сяўбы ўступіла 3 бядняцкія гаспадаркі, у калгас «Шлях беднака»—7 гаспадарак. Многія калгасы абавязаліся скончыць сяўбу да 25 мая.

***

ЛОЕЎ. (Па тэлеграфу). У трох сельсаветах Лоеўскага раёну 25 красавіка пачалася сяўба. Калгас імя Сталіна, Крупейскага сельсавету, засеяў 5 га віці і пачаў сеяць раньнюю бульбу.

„ГЭКТАРЫ АБАРОНЫ"

ЛОЕЎ. Калгасы Лоеўскага раёну рыхтуюцца да правядзеньня першамайскага сьвята з удзелам аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. У першамайскія дні будзе праведзена праверка падрыхтаванасьці аднаасобнікаў да сяўбы. Пры кожным калгасе і сельсавеце створаны праверачныя камісіі.

Многія калгасы арганізавалі вярбовачныя брыгады і вылучылі «чырвоных сватоў».

Усе калгасы рыхтуюцца засеяць «гэктар абароны». Дняпроўская камуна пастанавіла засеяць 5 га на абарону краіны.

Калгас „Новае жыцьцё"

ВЫКОНВАЕ ЎЗЯТЫЯ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

Працаваць ва ўсе дні сьвят, адпачываць у дні непагоды

КОИДАНАВА

Мы, калгасьнікі «Новага жыцьця», калгасу, які аб'яднае звыш 170 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, узялі на сябе рад практычных абавязацельстваў па веснавой сяўбе і калектывізацыі. **Мы высунулі сустрэчны плян веснавой сяўбы, які прадугледжвае пашырэньне пасеўнай плошчы на 184 га супроць пляну, абавязаліся перавесьці калгас на зьдзельшчыну, стварыць неабходныя насеньні і кармавыя фонды, па-бальшавіцку змагацца за новы калгасны прыліў.**

Даводзім да ведама ўсёй працоўнай грамадзкасьці, што калгас усе гэтыя абавязацельствы з гонарам выконвае. Мы дабіліся значнага прыліву і разам з астатнімі калгасамі Нарэйкаўскага сельсавету рыхтуемся **ў бліжэйшы час закончыць па сельсавеце суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы** (зараз сельсавет калектывізаван на 85 проц.), **мы цалкам перайшлі на зьдзельшчыну, афармляем пераход на спараную язду і па-ўдарнаму падрыхтаваліся да выхаду ў поле.**

Але-ж вынікі нашай работы ўсё яшчэ нельга назваць здавальняючымі. Таму і надалей наша баявая задача—упарта змагацца за тэмпы, за разгортваньне сацсаборніцтва і ўдарніцтва, за аўладаньне тэхнікай, за якасьць працы, за сустрэчныя нормы ва ўсіх галінах нашай работы.

Напярэдадні сьвята міжнароднай пралетарскай салідарнасьці—1 мая—у адказ на зварот тульскіх рабочых да ўсіх рабочых і работніц, калгасьнікаў і калгасьніц СССР, **мы абвяшчаем сябе ўдарнікамі імя «518» і «1040» і абавязуемся:**

1. У часе бальшавіцкай сяўбы адмовіцца ад усіх сьвят, працаваць сьвяточныя дні дапускаючы адпачынак толькі ў дні, непагоды, калі праца ў полі немагчыма.

2. Скончыць веснавую сяўбу ў максымальна-скарочаныя тэрміны і выканаць сустрэчны плян сяўбы.

3. Аказваць сталую практычную дапамогу новаарганізаваным суседнім калгасам.

4. Дабіцца прыкладнай працдысцыпліны шляхам пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны, аплаты працы выключна па колькасьці і якасьці. Прымаючы на сябе гэтыя абавязацельствы, зьвяртаемся да ўсіх калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў—аднаасобнікаў нашага раёну з гарачым першамайскім калгасным заклікам:

Мацней удар па кулаку і яго агентам—правых і «левых» апартуністам. Вышэй сьцяг суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва як клясы. Шырэй фронт сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва!

Па даручэньні калгасьнікаў праўленьне калгасу.



НА ПАГРАНІЧЧЫ

I.

«...І было таму якраз год. На поле выехалі мы. Сьвята першай баразны спраўлялі. Першы раз калгасам у поле. Са сьцягамі чырвонымі выйшлі аратыя. А за аратымі ўсе калгасьнікі. Як выйшлі ў поле, як урэзаліся ў зямлю лемяхі, песьню, вясёлую песьню засьпявалі... «Першую баразну на самой мяжы браці. На 6 мэтраў толькі адступалі і вунь тэй вёсцы...—рука расказчыка цягнецца на захад— у тэй вёсцы, Цынгелі яна завецца, - паназьбягалася народу-ўча. Глядзець, што-ж бальшавікі робяць. На стрэхі хат пазалазілі. Тут, вядома, жандары набеглі. Народ пачалі разганяць...»

— Ну і што-ж?

...Вядома што. Разагналі. На конях гойсалі. Нагайкамі лупцавалі.

...За сьцяной калыша грудное дзіця жанчына, гаспадыня хаты. Яна сьпявае нешта ціхае і цягучае. Мэлёдыя яе сьпеву тчэ сузор'і казкі—дзіўнай і фантастычнай. Гукі паволі заціхаюць, тады выразна пракураціе рыпеньне калыскі. Потым і гэта рыпеньне кудысьці зьнікае.

Яна вышла да нас, сярэдніх год жанчына, з маршчынамі, сьлядамі цяжкіх год жыцьця. Выцерла рукі аб фартух: Добры дзень дала. На лаўку села.

У хаце, з прычыны прыезду прадстаўнікоў з Менску, сабраліся калгасьнікі-дзяржыцы. Усім цікава паслухаць, што скажуць прыежджыя з Менску—інструктар Белкалгасцэнтру, малады, русы мужчына і прадстаўнік рэдакцыі. Трэба шмат аб чым пагаварыць, пра калгас, пра справы, пра веснавую сяўбу. І наплываюць пытаньні адно за адным: пра зьдзельшчыну, пра тое, як лён будуць сеяць, а як яшчэ яго потым управяцца зьбіраць, пра тое, што жывёле харчоў зусім слаба, а аблівы цялятам, а ўсё роўна выгадуем факт, а ня інакш.

У сенцах возьміца і сярдэта хрумкаюць сьвіньні. Глуха стукае сякач за перагародкай—бульбу нетта сячэ для сьвіней.

— Іду я, скажам, пакосам,—гаворыць гаспадар хаты— Яна ці Сьцяпан селі закурыць. А я што, горшы за іх? І я сеў. Глядзі, колькі часу пракурылі, сеў. Глядзі, колькі часу пракурылі, мае-яй-яй. Каб усё гэта падлічыць, многа вышла-б. А цяпер дык не, браце. Сядзі, хай на цябе халера. А я што зраблю, тое і зраблю. Вось яно і выходзіць...

На шуфлядзе акуратна складзены газэты.

— Чыталі мы—нечакана кажа жанчына поўным грудным голасам—чыталі мы ў «Правде» пра зьдзельшчыну. Добрая штука... а яшчэ чыталі і пра пастанову ЦК аб веснавой кампаніі.

— Яно сабе верна,—адзываецца высачэзны худы мужчына—на зьдзельшчыну іменна трэба перайсьці—у такт гамонцы хістаецца яго постаць, худая, нескладаная—выведзем на чыстую ваду гультая, а ну, вылазь, скажам, браток.

У куце два абразы. Пацямнелі лікі проць на сьцяне расквітае краскамі плякат аб МТС, і словы ў лёзунгу, гарачыя і бадзёрыя, клічуць даць большы разгон сталёвай коньніцы.

— Вось і ў Дрысе кажуць трактарная станцыя будзе,—зноў пасьля хвілінай цішыні гаворыць гаспадар хаты, і нам у мінулым годзе шмат трактары дапамаглі. А мы як пусьцілі іх па мяжы! як пусьцілі!...

За хату выйдзеш, трыста крокаў пройдзеш—у мяжу ўпрэшся. Па тры жэрдкі, зложаныя ў козлы вядуць 12-ці мэтровую лінію мяжы. Тут абрываецца жыцьцё краіны Саветаў і іменна тут як нідзе адчуваеш блізасьць капіталістычнага сьвету, які вось ад цябе блізка—па два крокі ступіць.

На ўзгорку зьлева панскі маёнтак. Як дзіка гучаць гэтыя словы «панскі маёнтак». Пан—уладар гэтага маёнтку—з захудалых, мае 60 дзесяцін, але шляхціц—аж пырскі з роту ляцяць. Сам не працуе. Парабкоў экспляатуе, сокі цісьне з іх. Чаму гэтаму пану «ісьціннаму дэмакрату» ня быць адданым служкай сваёй фашысцкай айчыны.

Уздоўж па ўзгорку раскінуліся вартавыя вышкі. Сьцерагуць жандары Латвію фашыстаў. Берагуць жандары ўладу паноў, капіталістаў. Зьлева за сьнегавым полем вёска. І назва вёскі Цынгалі.

Пуста і ціха зімовым часам на прымежных гонях. Роўнай белай пялёнкаю сьнег залёг. Толькі вышкі вартавыя чорнай эданьню праразаюць бяліць сьнегу.

II.

— Камуністычная партыя і Савецкая ўлада,—гаварыў дакладчык на сходзе калгасу, выказваючы думку мільёнаў лепшых калгасьнікаў парашылі перавесьці працу ў калгасах на зьдзельшчыну. Хто больш зробіць, той больш і заробіць.

У вялікім пакоі новай школы было ціха. Дакладчыка слухалі ўважліва.

Папярэдні сход калгасаў прыняў пастанову перайсьці на зьдзельшчыну. Учора да трох гадзін ночы сядзела праўленьне і абмяркоўвала нормы выпрацоўкі на асобных відах работ і аплату ў працаднёх. Там на праўленьні ў каторы ўжо раз чыталі інструкцыю і прыкладныя нормы выпрацоўкі, гаварылі пра сваё, пра тое, ці вывезуць коні ці не, бо корму мала, а коні слабыя, а норму ўзяраць—каня падкарміць трэба.

— Ну, скажам, добра ворыва ці бараванньне. А вось як з гноем быць? Адзін накладзе воз вялікі, а другі меншы. У аднага конь выцегне, а ў другога не. Вось табе і думай, мяркуй.

— Мала гэтага,—гаварыў Волесь,—норму трэба зрабіць. Хай яшчэ і добра зробіць, па-гаспадарску.

— А як-жа даведаешся, колькі ён зрабіў? Мерыць, на-мойму, трэба ці што? пытаўся малады хлапец.

— І запісаць каб акуратна.

— А які-ж з цябе гаспадар, калі ня ведаеш, колькі, скажам, у гэтым кавалку зямлі. Зьбяры брыгаду, дай брыгадзе апрацаваць які кавалак і зрабі—адазваўся з цемнаты хрыплы мужчынскі голас—разьбіся ў дзнёшку, а зрабі!

— Мы год пражылі ў калгасе. Навучыліся разумова, а яшчэ да гэтага не дайшлі,—гаварыў калгасны рымар,—як яно і куды?

Тады далі слова старшыні калгасу **Круміну.** Ён падняўся з лаўкі і цень яго высокай і худой постаці ўзьмятнулася на столі. Крумін чытаў тыя нормы выпрацоўкі, якія ўчора абмеркавала праўленьне—заараць гэктар, аднаконным плугам—палову гэктара за працадзень. Праца сярэдняя. Аплата ў адзін працадзень.

— Добра... Чытай далей.

— ...Ручны засеў ільну, норма на аднага чалавека 3 гэкт. у працадзень. Работа адносна да цяжкіх. Норма аплаты 1,25 працадня.

— Чытай далей... Згодны.

Так перабралі ўсе віды работ. Пасьля пастанавілі: у асноўным нормы выпрацоўкі зацьвердзіць. Хай на вытворчых нарадах кожны калгасьнік яшчэ падумае, памяркуе над нормамі.

Да стала прэзыдыуму падышоў камсамолец Генрых. Ён зьняў шапку, скамячыў яе ў руках і звонкі голас прарэзаў поўцемень.

— Мы ўсе камсамольцы і беспартыйныя абвяшчаем сябе ударнікамі бальшавіцкай сяўбы. Мы будзем старанна працаваць. Генрых перадаў старшыні сходу сьпіс і заяву новых ударнікаў. І зноў падняўся з лаўкі Крумін. Нясклаўная яго размова на гэты раз зрабілася яшчэ больш нясклаўнай.

— Я прымаю выклік і замацоўваю сябе у калгасе да канца пяцігодкі,—хвалюючыся, прамовіў ён.

Дружна запляскаў сход.

— А чаму старшынёй ня хочаш заставацца?—адазваўся жаночы голас.

— Хворы я быць старшынёй. Разам з вамі за плугам пайду.

— А партыя другога дасьць? Хай ячэйка вылучае!

— Нельга нам без камуністаў кіраваца.

— Правільна.

— Пішы «прасіць Росіцкую партыйную ячэйку...»

— Зноў наступіла цішыня, калі чыталі заклік тульскіх рабочых. Тут за сотню крокаў ад фашысцкай Латвіі, за які-небудзь дзесятак кілёмэтраў ад беларанскай Польшчы з вялікай увагай, з захапленьнем слухалі слаўную гісторыю барацьбы за тысячу сорак, за пяць сот васемнаццаць. Пісалі адказ тульскім рабочым, выклікалі калгасьнікаў Беларусі Савецкай. Бралі на сябе абавязак уцягнуць да канца году аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў вёсак Сандрава, Кулакова, Васілева і Бурбова ў калгас.

У канцы сходу зноў гаварылі пра зьдзельшчыну, пра абязьлічку і словы «зьдзельшчына», «абязьлічка», спачатку чужыя і незразумелыя, цяпер станавіліся сваімі, роднымі, блізкімі.

Аб старшыні калгасу парашылі: адпусьціць Круміна з працы старшыні, тады як партыя вылучыць другога камуніста. І ў гэтай аднадушна прынятай пастанове было назьмернае давер'е адзіначку кіраўніку партыі Леніна—бальшавіком...

...Выходзілі з хаты, штурхаліся ў дзьвярох.

Са стрэх капала. Правальвалася пад нагамі дарога. Дзесьці на хутары адзінока вітаў надыход дня певень. У калгасе пачыналася пераклічка пеўняў.

— Ну, значыць, і выяжджаць хутка будзем...

— Адразу-ж у поле выйдзем! Хай вось толькі сьнег зьядзе.

На варце мяжы ня спалі армейцы Фэлікса Эдмундавіча. Чырвоныя пагранічнікі вартавалі краіну Саветаў. Дзяржынцы несьлі баявыя дазоры. І порах быў сухім, вінтоўкі прачышчаны і змазаны.

Калгасьнікі недарма насілі імя жалезнага Фэлікса. У калгасе імя Дзяржынскага сёньня была баявая трывога—праверка падрыхтаванасьці да сяўбы. Насеньне атышчана і ссыпана, плугі адрамантаваны, машыны змазаны.

Паплывалі з цемені постаці людзей і раставалі.

— Ну, бывайце, спаць трэба...

Шарэў усходні край неба. Нячутна надыходзілі досьвіткі.

III.

З вакна райкому як на далоні відаць адзінокія хаты польскага хутара. Ля ног **Дрысы** плешчанца Заходняя Дзьвіна. За Дзьвіной над беларанскім ботам Беларусь Заходняя.

— Чым больш у нас посьпехаў, тым больш прыяцеляў і тут і там — дэлегат з калгасу, які гаворыць гэта, паказвае рукой на вакно ў бок Польшчы.

Ідзе раённая нарада калгаснага актыву. Нарада аб зьдзельшчыне, аб падрыхтаванасьці да сяўбы. Да стала прэзыдыуму выходзяць дэлегаты з калгасаў. У кожнага куча сваіх клопатаў, у кожнага рапарт баявой гатоўнасьці да сяўбы.

Ціха ў залі, калі вырастаюць жахлівыя малюнкі фашысцкага тэрору ў Зах. Беларусі. Ліда, Луцк, Кобрына—гэта вось тут, недалёка ў Польшчы, за Дзьвіной. Жахлівыя малюнкі катаваньняў, дзікія сцэны гвалту, увасгросныя мэтады гішпанскай інквізыцыі. Аўтада-фэ польскай аханкі, на аснове навейшай тэхнікі. Аўта-да-фэ ў саюзе з электрычнасьцю, з цывілізаванай удасканаленасьцю. Аб замураваных тысячах барацьбітоў за працоўных, аб зажыва пахаваных—гавораць дэлегаты.

— Мы не забясьпечаны ад грукату гарматаў і рокату кулямётаў. Вораг за мяжой ня сьпіць. Ой, ня сьпіць! А ў нас кулак хіба сьпіць ці што? Але чым у нас больш посьпехаў, тым бліжэй час сусьветнага кастрычніка!

— Правільна кажаш—ня ўстрымліваецца пажылы мужчына і падымаецца з лаўкі, каб лепш пачуць.

— А нам больш працаваць трэба, гаворыць дэлегат з—другога калгасу у калматай шапцы—лепш арганізаваць працу, зьдзельшчыну наладзіць.

А вось сівы дэлегат з прымежнага калгасу, ён гаворыць пра новае калгаснае жыцьцё, пра свой калгас.

— Жыцьцё наша коціцца шпарчэй за сонца. Трэба сілы напружыць, сонца пераганяць, каб ад жыцьця не адстаць.

***

Ноччу над мястэчкам плывуць тартанныя гукі радыё. Радыё-рупары роўна ў 12 гадзіне разносяць над мястэчкам урачыстыя і бадзёрыя гукі «Інтэрнацыяналу».

З далёкай Крамлёўскай вежы, сэрца краіны Саветаў—Масквы—плыве сымфонія тэраічнага «Інтэрнацыяналу», з якім паўстане пралетарыят на рашаючы бай. «Інтэрнацыянал» прарываецца праз абледзянелую Дзьвіну, праз жандарскія заставы ў Польшчу, у Заходнюю Беларусь. «Інтэрнацыянал» кліча да паўстаньня пракляцьцем катаваных.

У тэраічнай сымфоніі «Інтэрнацыяналу» вырастае гул пераможнага наступленьня 518 і 1.040. Тых пяцісот васемнаццаці, што ўрэзваюцца грамадамі карпусоў у неба, тых тысяча сарака, што ўрэзваюцца ў зямлю і расчышчаюць шляхі ў вёсцы для калгасаў і камун.

«Інтэрнацыянал» урачыста гучыць над мястэчкам і ў рытме яго сымфоніі ў нявымернай магутнасьці нарастаюць словы мільёнаў, якія сёньня так проста,—сказаў сівы дзядзька на раённай калгаснай нарадзе.

Ён падышоў да трыбуны і сказаў:

— Жыцьцё наша коціцца шпарчэй за сонца. Трэба сілы напружыць, сонца пераганяць, каб ад жыцьця не адстаць.

Калгас імя Дзяржынскага, Дрысв.

Ал. Ліпнёвы.

1 мая—першы дзень ажыццяўлення новай крэдытнай рэформы

Першага мая ўступае ў моц важнейшая пастанова партыі і ўраду аб гаспадарчым разрахунку, аб новым парадку крэдытаваньня гаспадаркі.

Калі фармуляваць, якія тэмпы трэба браць бальшавіком у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, дык гэта можна было-б зрабіць спасыланьнем на тры характэрныя лічбы: прырост прадукцыі на 45 проц., зьніжэньне сабекошту на 10 проц., пуск 518 новых гіганцкіх прадпрыемстваў.

Для выкананьня гэтых грандыёзных задач прамысловасьці трэба прайсьці праз гарніла гаспадарчага разрахунку—гэтага асноўнага вагара кіраваньня абагуленай гаспадаркай на даным этапе.

Бальшавіцкія тэмпы патрабуюць, каб пытаньні накапленьня, зьніжэньня сабекошту, эканоміі, рацыяналізацыі ня толькі дыктаваліся агульнымі задачамі, выплываючымі з нашага сацыялістычнага будаўніцтва, але і зрабіліся асноўнымі умовамі дзейнасьці любога прадпрыемства, любога гаспадарчага органу. Жыць і разьвівацца па-за гэтымі умовамі ні аднэй гаспадарчай адзінцы нельга.

Гэта можа быць дасягнута толькі пры самым жорсткім гаспадарчым разрахунку, пры суровай фінансавай і крэдытнай дысцыпліне, бо выразны гаспадарчы разрахунак — непрымірымы вораг разьбіздзяйства, безадказнасьці, непаваротлівасьці і іншых гнойнікаў, якія разьядаюць наш гаспадарчы арганізм і перашкаджаюць пасьпяховаму аўпадаць тэмпамі.

Новыя ўмовы крэдытаваньня гаспадаркі кладуць канец пенасьці і абломаўшчыне ў галіне выкананьня прамфінпляну. Пастановамі партыі аб парадку крэдытаваньня гаспадаркі з 1-га мая канфіскуецца самы бязьлітасны ўдар па лёгкадумных і наплявацельскіх адносінах з боку гаспадарнікаў да фінансавых вынікаў работы свайго прадпрыемства. Гэтымі пастановамі кладзецца канец утрыманскай псыхалёгіі, імкненьню пакрываць прарывы свайго пляну за рахунак дзяржаўнай нішчы.

Гэтыя традыцыі і настроі харчаваліся існаваўшым у банку «аўтаматызмам» і простым чынам выплывалі з грубейшых скажэньняў пры правядзеньні крэдытнай рэформы.

Ня тое цяпер. З 1-га МАЯ ДЗЯРЖБАНК НІКОМУ НІЯКІХ ПРАРЫВАЎ НЕ ПАКРЫВАЕ. Аматарам пакрываць прарывы за рахунак Дзяржбанку [illegible] дзецца «пашукаць» іншыя мэтады работы, такія мэтады, ужываньня якіх і можа толькі ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСЕБАКОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ НАМЕЧАНАГА ПЛЯНУ. А дзяржава праз Дзяржбанк БУДЗЕ ПРАВЯРАЦЬ ГЭТУ РАБОТУ РУБЛЁМ. Калі да гэтага часу прарывы ад няўмелай работы «аўтаматычна» пакрываліся Дзяржбанкам, у выніку чаго віноўнікі заставаліся доўга незаўважанымі, дык з 1-га мая найменшы прарыў у пляне выкрыецца безадкладна і перад кожнай гаспадарчай адзінкай з усёй няўмельнасьцю будзе паст[illegible]ена пытаньне аб тым, як працягваць работу далей, бо «аўтаматычна» пакрываць прарыў ніхто ўжо ня будзе.

Зьмяняецца і роля Дзяржбанку. Банк ня будзе больш займацца плянаваньнем гаспадаркі. Да гэтага часу ў гэтых адносінах стварыліся абураючыя сулярэчнасьці: замест кантролю рублём, замест абароны дзяржаўнай кішэні, банк узяўся адказваць за гаспадарчы орган, уваходзіў, так сказаць, у яго «цяжкае становішча». У выніку ад такой «дапамогі» гаспадарчай арганізацыі дзяржава двойчы траціла: траціла, па-першае, таму, што гаспадарчы орган, апіраючыся на «дапамогу» Дзяржбанку, быў пазбаўлены ўсялякі стымулёў да накапленьня, як і наогул да барацьбы за выкананьне свайго пляну, а, па-другое, дзяржава траціла таму, што такая дапамога прыводзіла да простых перакрыцьцяў прарываў асобных гаспадарчых органаў за яе (дзяржавы) рахунак.

Выходзіць так, што выгравала не гаспадарка і нават не асобная яе адзінка, а была простая страта для ўсёй дзяржавы ў цэлым за кошт няўменьня гаспадарнічаць, за кошт разьбіздзяйства, за кошт зьніжэньня тэмпаў нашай работы.

ПЕРШАГА МАЯ НОВЫ ПАРАДАК РАБОТЫ БЕЗАГАВОРАЧНА ЎСТУПАЕ Ў МОЦ. Калі хто-небудзь з гаспадарнікаў думаў аб магчымых адтэрміноўках, дык праз дзень ён будзе мець магчымасьць пераканацца, што глыбока памыляўся. Усю моц праверкі рублём будзе адчуваць у першую чаргу той, хто горш падрыхтаваўся да гэтага тэрміну, хто не заключыў дагавароў на пастаўку і рэалізацыю, хто пёгкадумна адносіўся да ўкараненьня ў сваім прадпрыемстве ці гаспадарчым органе гаспадарчага разрахунку, хто меркаваў, што і надалей яму хтосьці прыдзе «на дапамогу».

З ПЕРШАГА МАЯ ЎСТУПАЕ ЖОРСТКІ ПАРАДАК КРЭДЫТАВАНЬНЯ: НЯМА ДАГАВАРОЎ—НЯМА І КРЭДЫТУ, А, ЗНАЧЫЦЦА, НЯМА І ГРОШАЙ.

Партыя будзе рашуча патрабаваць ад [illegible] выразнага і безагаворачнага [illegible] разрахунку, аб беражлівых адносінах да рубля, бо на даным этапе — гэта асноўны вагар у барацьбе за пяцігодку, у барацьбе за нашы бальшавіцкія тэмпы, за выкананьне грандыёзных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

ФЕЛЬДМАН.

ПЕРАМОГА ФРЭЗЭРОЎШЧЫКАЎ

Пачыналіся іскамі аказаліся 16 старых фрэзэроўшчыкаў машыннага цэху Менскай абутковай фабрыкі. Прачытаўшы верасьнёўскую адозву ЦК УсеКП(б), яны паранцылі пакласьці канец тым агідпасьцям, якія тварыліся ў цаху.

Калі машыны кінулі стукаць, у цэху сабраліся фрэзэроўшчыкі. Пакідаючы работу, рвачы шыпелі голасам скуравальных машын:

— З чыць у вылучэнцы захацелі, кар'ерысты...

— Правільна, за табою ня пойдзем,— адказалі рвачом фрэзэроўшчыкі.

З цэху выплылі рвачы. Ня выходзілі доўга фрэзэроўшчыкі. Разьмяркоўліся хто як папала.

Пачуўся голас:

— Дакладвай, тав. Лупян.

— Не, лепш няхай Люнінскі гаворыць.

Люнінскі пачаў гаварыць. Спачатку нясклада атрымлівалася, але паступова голас яго рабіўся ўсё ўпэўненей і мацней:

— Фабрыка нашу назвала сябе ўдарнай. Мы ўсе абвясьцілі сябе ўдарнікамі, а прамфінпляну ня выконваецца. За якасьць нас праклінаюць пакупцы. Нам патрэбна арганізаваць брыгаду, моцна ударыць па рвацтве і разгільдзяйстве. Анархісты навінны пачуць, што так працаваць, як мы працавалі да гэтага часу, мы не навінны і ня будзем...

— Хто хоча гаварыць?—спытаўся Лупян.

— Ды што гаварыць, правільна сказаў Люнінскі,—у адзін голас адказалі фрэзэроўшчыкі.

— Я прапаную арганізаваць у камуну,сказаў Голанд.

— Камуна, вядома, рэч добрая, але ў камуне прыдзецца заробак дзяліць на роўныя часткі. Па-мойму, пакуль што гэтага рабіць нельга,— растлумачыў член партыі тав. Іоспэ.

Гэта пытаньне выклікала ажыўленыя спрэчкі з боку рабочых. Адны згадзіліся пайсьці нават на ўраўнёўку, абы работа не цярпела. Іншыя даводзілі, што паставіць у аднолькавыя ўмовы аплату кваліфікаванага рабочага з малакваліфікаваным нельга. Доўга гаварылі і, нарэшце, пастанавілі арганізаваць камуну. Высокакваліфікаваным рабочым вылучыць больш процант з агульнага заработку камуны. Прыработак таксама дзяліць у адпаведнасьці з кваліфікацыяй рабочага. Камуна фрэзэроўшчыкаў надала сабе імя Сталіна.

Камуна пачала працаваць на 3 зьмены. Між кожнай зьменай былі заключаны «сквозные» дагаворы па сацпаборніцтве. У зьменах вылучаны рабочыя, якія нясуць адказнасьць за якасьць прадукцыі.

Пачалася сапраўдная барацьба за высокую прадукцыйнасьць, за якасьць. Камуна дабілася бліскучых результатаў. Камунары выконваюць свой плян па ўсіх паказальніках.

У працэсе работы камуна ўпэўнілася, што на фрэзэроўцы даволі 13 чалавек замест 16. Камунары дабіліся ў заводзкіх арганізацыях пераводу 3-х чалавек на іншую работу. 13 чалавек прапускаюць замест 3.300 пар абутку 4 тысячы.

У цэху былі выпадкі, калі рабочыя другой зьмены спазьняліся на работу. З гэтай прычыны прастойваў увесь цэх. Камуна па сваім пасяджэньні пастанавіла, што кожны камунар не павінен пакідаць машыны да прыбыцьця новай зьмены. Тыя, што спазьняліся, выклікаліся на сход камуны, які выносіў ім спагнаньні.

З кожным днём камуна імя Сталіна дабівалася новых тэмпаў, новых перамог у барацьбе з рвачамі, у барацьбе з анархістамі.

Прыклад сталінцаў аказаўся заразьлівым. Пачалі арганізоўвацца ўдарныя брыгады на фабрыцы. Зараз іх 43 з агульным ахопам рабочых на 90 проц. Старэйшыя брыгадзіры іншых цэхаў наведваюць агульныя сходы перадавой камуны імя Сталіна, каб выкарыстаць яе вопыт.

Камуна імя Сталіна ня толькі зьнішчыла недахопы ў сябе. Яна пільна сочыць за работай іншых брыгад.

У брыгадзе па шклоўцы абмацаў справа стаіць нядобра. Там, дзе павінны паводле пляну працаваць 4 чалавекі, працавала 6-7. Адміністрацыя цэху павялічвала штат рабочых па шклоўцы для таго, каб унікнуць затрыманьня работы канвэеру.

Сталінцы ўпэўніліся, што гэта ня выхад са становішча. Яны ўзялі брыгаду па шклоўцы на грамадзкі буксір. Камунары ступцілі з упартым супраціўленьнем в боку кіраўнікоў брыгадай шклоўцы, якія гаварылі:

— Мы не рвачы, нам шмат грошай непатрэбна, нехай працуюць і другія.

Камуністы Вялічка, Пратасэвіч і Захаруўскі падрыхтавалі рэзалюцыю таварышчы адсталых рабочых. Фабрычныя арганізацыі пашлі на лінію найменшага супраціўленьня і распусьцілі брыгаду шклоўцы. А ў гэтай брыгадзе была большасьць ударнікаў, якія добра працавалі. Ці патрэбна была дапамога ня толькі з боку камуны, але і з боку фабрычных арганізацый для таго, каб пазбавіцца ад ілжэўдарнікаў.

Камуна імя Сталіна сыстэматычна запрашала на свае сходы шклоўшчыкаў. З кожным днём шклоўшчыкі ўпэўніліся, што працаваць старымі мэтадамі гаечна і пачалі барацьбу за павышаныя тэмпы работы. Да дня 1 мая шклоўшчыкі рапартуюць камуне:

— Мы выправілі свае памылкі. У зьмене па шклоўцы замест 7 чалавек працуе 4. Мы вам, таварышы, абяцаем, што па вашым прыкладзе будзем змагацца за выкананьне і перавыкананьне пляну па ўсіх паказальніках...

Гэтыя факты паказваюць, што камуна імя Сталіна змагла ня толькі паставіць у сябе правільна работу, але і перадаць свой вопыт, заразіць сваім прыкладам і іншыя цэхі фабрыкі.

— Фрэзэроўшчыкі, арганізаваўшыся ў камуну, — расказвае Іоспэ,—мелі ў сваіх радах толькі двох камуністаў. Маючы вытворчы стаж ад 20 да 40 год, лепшыя ўдарнікі, усьвядомўшы правільнасьць генэральнай лініі партыі, палічылі немагчымым быць па-за яе радамі. Яны адказалі калектыўным уступленьнем у рады ленінскай партыі.

Зараз у камуне толькі адзін беспартыйны, але і гэты ў дні 1 мая ўступае ў рады КП(б)Б.

— Зараз мы ў камуне можам арганізаваць партыйную ячэйку, — з усьмешкай гаворыць Іоспэ.

На фабрыцы камуна зьяўляецца ўзорнай і карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Камунары выбраны ў цэхпартячэйку. Арганізатар камуны т. Іоспэ зьяўляецца сакратаром партыйнай ячэйкі цэху. Таз. Лупян — старшыня цэхпрафкамітэту.

Пры пераглядзе норм і расцэнак камуна павялічыла норму кожнага рабочага з 315 пар мужчынскага абутку да 450 пар.

Прыкладу камунараў-сталінцаў сьледуюць іншыя рабочыя. Плян першага кварталу выкананы на 100,5 проц.

Сёньня ўдарнікі менскай абутковай яшчэ вышэй пальмуць сьцяг барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за сацыялістычныя формы працы.

А. МАНЬКОЎ.

1 мая—сьвята працоўных—адзначаем новымі перамогамі

Пускаем новую цукеркавую фабрыку

1 МАЯ ў МЕНСКУ ПУСКАЕЦЦА НОВАЯ МЭХАНІЗАВАНАЯ ЦУКЕРКАВАЯ ФАБРЫКА. ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ЯЕ — 18 ТЫСЯЧ ТОН ЦУКЕРКАВЫХ ВЫРАБАЎ У ГОД (КАРАМЕНЬ, МЯККА-ШАКАЛЯДНЫЯ ЦУКЕРКІ, ШАКАЛЯД, КАВА). ПАВУДОВА ФАБРЫКІ КАШТАВАЛА ПАЎТАРА МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ.

Першая „сквозная" атрымала ордэн працоўнага сьцягу

Ударнікі і рабочыя гомельскага машына-будаўнічага заводу «ПРАЛЕТАРЫ» адзначаюць 1 мая вялікім сьвяточным вечарам. На вечары ўдарнікаў заводу будзе ўручан пераходны сьцяг імя ЦК КП(б)Б, прысуджаны заводу конкурснай камісіяй пры ЦСПСБ за перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу. «Сквозная» брыгада па выробе растворамяшалак за значнае ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы атрымала ордэн чырвонага працоўнага сьцягу.

Першая ў калёне

1 мая па дэманстрацыі працоўных Бабруйску першымі ў калёне дэманстрантаў пойдуць прадпрыемствы, якія выканалі і перавыканалі прамфінплян першага кварталу: мармэлядавая фабрыка «Чырвоны харчавік», шчацінная фабрыка, друкарня і лесазавод № 6.

Усе цэхі—на гаспадарчы разрахунак

На фабрыцы «БЕЛАРУСКА» (Менск) з 1 мая ўсе цэхі пераводзяцца НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК. За лепшае выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прэміюецца пераходным прызам вытворчая камуна дубляроў з 9 чалавек (т. т. БЕЛЕНЬКІ, КАРАВАЙ, КОЎШЫК, МІРУТКА, ТАСЬМАН, КАГАН, ПАПЕРНА, ДЫЛА, САВІЦКАЯ). Прэміююцца таксама асобныя ўдарнікі, 11 маладых рабочых і работніц падалі заявы аб уступленьні ў камсамол.

Чырвоны сьцяг—лепшаму цэху

Конкурсная камісія заводу «Бальшавік» прысудзіла пераходны сьцяг па ўнутры-заводзкім конкурсе 1-му хромавага цэху. 1-ы хромавы выканаў праграму першага кварталу на 105,17 проц. у цэйпасным азначэньні і на 111,06 проц. — у каштоўным азначэньні; зьніжэў сабекошт замест 5,62 проц. на 7,28 проц.; перавыканаў заданьні па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і якасьці прадукцыі. 15 лепшых рабочых з вялікім вытворчым стажам перададзены цэхам у рады партыі. 80 проц. рабочых змацаваліся на заводзе да канца пяцігодкі. У апошні час арганізаваны дзьве новыя ўдарныя брыгады імя «518» і «1040». Цэх добра арганізаваў складаньне сустрэчнага прамфінпляну і павялічыў кантрольную лічбу на 13,82 проц., цапоўніўшы плян рацыяналізацыі 37 прапановамі.

Суботнік у прыгарадных саўгасах

ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА ЎДАРНІКАЎ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» ПАСТАНАВІЛА 2 МАЯ АРГАНІЗАВАЦЬ СУБОТНІК У ПРЫГАРАДНЫХ САЎГАСАХ І КАЛГАСАХ. 300 РАБОЧЫХ ПАЕДУЦЬ НА СУБОТНІК У КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ, РЭШТА ПРАЦУЕ НА ЗАВОДЗЕ.

Тав. ЯКІМАЎ, брыгадзір камуны фармаўшчыкоў піцейнага цэху віцебскага заводу «Чырвоны мэталіст». Камуна зьнішчыла зусім брак і ПЕРАВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ НА 50 ПРОЦ.

Лесазавод „Пралетары" гатоў да пуску

З 15 мая завод пе[illegible]ліць на 7-гадзінны рабочы дзень

[illegible] міністэрсыйна-тэхнічнасаніцыйнага заводу [illegible] Мазыр

У жніўні [illegible] гаду пачаў будавацца наш завод. На гле[illegible] дзячы [illegible] — [illegible] часовае атрыманьне абсталяваньня недаквят выстарчальнай колькасьці [illegible]ўнічых рабочых — ЗАВОД ДА 1-га МАЯ ГАТОЎ ДА ПУСКУ. Дзякуючы разгорнутаму сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву, завод будаваўся сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі.

Замест старога заводу, які згарэў, пабудавали новы, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Устаноўлена 5 быстраходных варштатаў савецкай вытворчасьці замест 4 старых гофманскіх варштатаў і механічная саматаска для падачы калод. У 1932 годзе будуць мэханізаваны ўсе цэхі па апошняй тэхніцы. ПРАГРАМА [illegible] ЦОЎКІ ПІЛАМАТАРЯЛАЎ [illegible]ЧВАЕЦЦА НА 145 ПРОЦ. [illegible] нагрузцы 3-х-зьмённай [illegible] пік рабочых дойдзе да 500 [illegible] замест 260, якія працавалі раней. З 15-га МАЯ ЗАВОД ПЕРАХОДЗІЦЬ НА 7-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты намі дзякуючы правільнай генэральнай лініі нашай партыі, дзякуючы энтузіязму рабочых заводу.

Мы абяцаем упарта змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Дырэктар заводу СТАНІШЭЎСКІ.
Сакратар партячэйкі РЫКЛІН.
Старшыня заўкому МЭЛЬЦЭР.

Камсамольцы рацыяналізатары (зьлева-направа) таа. ЛЕБЯДЗЕЎ і МАРЫНОЎСКІ—рабочыя Віцебскай акулярнай фабрыкі, высунутыя ў аддзел рацыяналізацыі фабрыкі.

Т. т. Лебядзеў і Марыноўскі далі рад рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць эканомію 97 тысяч руб. у год.

Таварышы зьяўляюцца ініцыятарамі і арганізатарамі паточнай сыстэмы працы на фабрыцы.

Суботнік для ліквідацыі прарыву

РАБОЧЫЯ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ, АБМЕРКАВАЎШЫ НА ДЭХАВЫХ І АГУЛЬНЫХ СХОДАХ ВЯЛІКІ ПРАРЫЎ, ЯКІ СТВАРЫЎСЯ Ў СУВЯЗІ З ПАВОДКАЙ, ПАСТАНАВІЛІ з МАЯ АРГАНІЗАВАЦЬ СУБОТНІК САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ.

1 МАЯ НА ЎРАЧЫСТЫМ ВЕЧАРЫ РАБОЧЫХ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ БУДЗЕ ПРЭМІЯВАНА КАМУНА ФРЭЗЕРОЎШЧЫКАЎ, ЯКАЯ ПЕРАВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН ПЕРШЫХ 4 МЕСЯЦАЎ 1931 ГОДУ ЯК ПА ЯКАСНЫХ, ТАК І ПА КОЛЬКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ.

Камунараўцы арганізавалі новыя ўдарныя брыгады і камуны

Рабочыя сьлесарна-зборачнага цэху заводу «Камунар» да другой гадавіны сацспаборніцтва і 1 мая арганізавалі 4 вытворчыя камуны. У кузьнечным цэху арганізаваны 4 новыя ўдарныя брыгады. У такарным цэху—2 вытворчыя камуны. Апрача таго, 26 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі (у індывідуальным парадку). 28 ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў КП(б)Б, 20 маладых рабочых—у ЛКСМ. 15 лепшых ударнікаў прэміяваны. Адначасова выяўлена 16 ілжэ-ўдарнікаў.

Сьвята гэройскай сацыялістычнай ударнай працы

Рабочая кляса СССР і БССР пасьля гіганцкіх посьпехаў першых двух год у справе рэканструкцыі народнай гаспадаркі в непахісная энэргія, з пячуваньнем энтузіязмам пракладае свой шлях да далейшых посьпехаў, **да завяршэньня у гэтым годзе фундаманту сацыялістычнай эканомікі.**

У гэтым годзе **1 мая** ператвараецца ў грандыёзнейшае сьвята гэройскай, ударнай працы, у сьвята бурных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, разгорнутых перадавой ударнай калёнай міжнароднага пралетарыяту — рабочай клясай СССР. Гэтыя гіганцкія посьпехі ў справе будаўніцтва сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы сталі магчымымі толькі на аснове вялізарнай актыўнасьці рабочых мас і правільнага кіраўніцтва камуністычнай партыі.

ІДЭЯ ЛЕНІНА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЕЦЦА

29-га красавіка споўнілася другая гадавіна сацспаборніцтва і ўдарніцтва. На вопыце ўзроснага вялікага руху ўдарніцтва па ўсім Саюзе, у тым ліку і па БССР, відавочна ажыцьцяўляецца вялікая ідэя Леніна аб сацыялістычным спаборніцтве. Уладзімер Ільліч пісаў: «Сацыялізм ня толькі не пагашае сацспаборніцтва, а наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужываць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, ущягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць правяць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе—непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, душыў тысячамі і мільёнамі. Наша задача зараз, калі сацыялістычны ўрад на чале ўлады,—арганізаваць спаборніцтва».

За два гады сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод пралетарыяту БССР разьвівалася, вырасла і аформілася ў магутны рух, у сапраўды рухомую сілу сацыялістычнага будаўніцтва.

ЗВЫШ 60 ПРОЦ. УДАРНІКАЎ

У верасьні 1929 г., да першай праверкі дагавароў па сацспаборніцтве, колькасьць ударнікаў у БССР з агульнай колькасьці рабочых складала толькі 3 проц. Праверка сацспаборніцтва на прадпрыемствах, праведзеная значная масавая работа на папулярызацыі значэньня ленінскага спаборніцтва—сырылі хуткаму росту сацспаборніцтва. У сьнежні 1929 г. лік ударнікаў павялічваецца да 15 проц. Да другой праверкі ў сакавіку 1930 г. армія ўдарнікаў ужо налічвае 46 проц. рабочых клясы. У сувязі з ленінскім прызывам, верасьнёўскай адозвай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б колькасьць ударнікаў нязкільгарасьце, і на 1 студзеня 1931 г. пралетарыят БССР налічвае ў сваіх радах ужо звыш 60 проц. ударнікаў. (Паводле абсьледваньня 57 прадпрыемстваў).

Характэрным для росту ўдарніцкага руху, для таго, каб упэўніцца, якую сілу мае прыклад партыі сярод рабочых мас, для таго, каб уявіць сабе, як рабочая кляса на закліку сваёй партыі мабілізуе ўсю сваю энэргію на выкананьне прамфінпляну,—можа служыць узросшы рух сацспаборніцтва і ўдарніцтва на прадпрыемствах у сувязі з ленінскім прызывам.

У выніку прызыву, паводле няпоўных даных, ударніцтва вырасла: ударных прадпрыемстваў—з 23 да 109, цэхаў—з 248 да 671, брыгад—з 1.568 да 8.155, калектываў і камун—з 72 да 337, індывід. ударніцтва—з 5.526 да 10.514 чал.

Вялізарнейшы ўздым вытворчай актыўнасьці і ініцыятывы рабочае клясы побач з разьвіцьцём сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўвесь час высоўвалі і высоўваюць новыя вышэйшыя формы сацспаборніцтва. Шырокае разьвіцьцё на прадпрыемствах БССР «сквозных» ударных брыгад, апэрацыйна-плянавых груп, грамадзкага буксіру, сацыялістычнага канвэеру па якасьці, вытворчых манэўраў і, нарэшце, аднаго з магутнейшых рухавікоў сацспаборніцтва—сустрэчнага прамфінпляну—усё гэта давала і дае на справе магчымасьць ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады, а па радзе галін—за тры гады і яшчэ больш кароткія тэрміны.

УДАРНІКІ ПАКАЗВАЮЦЬ ЛЕПШЫЯ УЗОРЫ ПРАЦЫ

Дзесяткі фабрык і заводаў, сотні цэхаў, сотні ударных брыгад у сваёй барацьбе за прамфінплян шчодзенна паказваюць рост прадукцыйнасьці, набываньня на камуністычных адносінах да працы, на сацспаборніцтве і ўдарніцтве.

Ударнікі мэталёнага цэху фабрыкі імя Клары Цэткін—пры сярэднім павялічэньні прадукцыйнасьці працы ў гэтым цэху на 5,6 проц.—павялічылі сваю прадукцыйнасьць на 24,7 проц. Ударная зьмена 9-га варштату гуты «Ільліч» дае ўсяго 1 проц. браку, тады як няўдарнікі гэтага цэху—8 проц. браку. Менская абутковая фабрыка—камуна фрэзэрышчыкаў у 12 чал. выпускае 1.600 пар абутку ў дзень, у той-жа час на гэтым-жа працэсе 15 чал. няўдарнікаў выпускаюць 1.200 пар. На мэталянапрацоўчым заводзе «Пралетары» арганізаваная «сквозная» брыгада ў 165 чал. пачала выпускаць 100 растворамяшалак у месяц у той час, як да арганізацыі «сквозной» брыгады выпускалася толькі 36 растворамяшалак.

СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН Б'Е ПА АДСТАЛАСЬЦІ

А вось рад красамоўных сьведкаў сілы і значэньня сустрэчнага прамфінпляну, як вышэйшай формы сацспаборніцтва, якая ўпітвае найшырэйшыя масы рабочае клясы ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва, плянаваньне гаспадаркі і выкрывае вялізарнейшыя вытворчыя магчымасьці, што таіцца ў гаспадарчым арганізме кожнага прадпрыемства, саўгасу, калгасу.

На швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» рост прадукцыйнасьці працы на 1931 г. паводле пляну адміністрацыі быў вызначан у 32,07 проц., рабочыя высунулі сустрэчны плян у 68,2 проц. Па напіравай фабрыцы «Прафінтэрн» сустрэчны высунуў рост прадукцыйнасьці ў 10,76 проц. замест 2,84 проц. На заводзе імя Варашылава сустрэчны прамфінплян даў павялічэньне прадукцыйнасьці працы супроць намечанага заводаўкіраўніцтва на 9,7 проц.

На 15 прадпрыемствах з агульным лікам работных у 12.563 чал. была унесена у сувязі з прапановай Кантрольных лічбаў на 1931 г. 2.051 рабочая прапанова, што дае ў сярэднім адну рабочую прапанову на 6 рабочых. Эфэктнасьць прапаноў ва многіх выпадках вельмі значная. Так, па швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» эфэктнасьць па пяці толькі прапановах складае 240 тыс. руб. у год. Па «Палесдруку» 24 рабочыя прапановы далі 105.070 р. у год.

Паказаныя факты зьяўляюцца толькі вельмі нязначнай часткай грандыёзнейшага значэньня сацспаборніцтва ў поўным яго аб'ёме.

АДНАК, І НЕДАХОПЫ НЕМАЛЫЯ

Але было-б вялізарнай памылкай, побач з вялікімі посьпехамі ва ўдарніцкім руху, закрываць вочы на рад яўна цёмных бакоў, галоўным чынам па лініі кіраўніцтва і ўзначаньваньня гэтага руху з боку паасобных зьвеньняў прафарганізацый. Дзесяткі фактаў пацьвярджаюць адсутнасьць на многіх фабрыках усякага ўліку, ахопу ўдарніцтвам, ўліку эфэктнасьці сацспаборніцтва. Апрача таго за апошні час былі выкрытыя выпадкі простага апаганеньня сацспаборніцтва, выпустошваньня яго зьместу (Віцебск—акулярная фабрыка, абутковая ф-ка, Мекск—завод «Камунар»). Паўтараюцца вылазкі клясавага ворага і яго агента на фабрыцы супроць пацменаў, а па сутнасьці супроць перадавога ўдарніка (торфазавод, «Камунар»). Далёка невыстарчальная на многіх прадпрыемствах барацьба з ілжэ-ўдарніцтвам. Няма сапраўднага штодзённага кантролю, праверкі і самаправеркі—гэтай важнейшай справы. Пэрыядычныя праверкі ні ў якім выпадку ня ў стане зьмяшчыць тыя ненармальнасьці, якія накапляюцца даволі шмат у кожным прадпрыемстве, цэху, брыгадзе і г. д.

НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЯ БАРАЦЬБА З ІЛЖЭ-ЎДАРНІЦТВАМ

З боку многіх «трыкутнікаў» на прадпрыемствах у сувязі з тым, што не праводзіцца масава-выхаваўчая работа, паліраваная на перавыхаваньне адных ілжэўдарнікаў, якія не ўарылі ўсёй глыбіні, усёй важнасьці сацыялістычнай працы, а таксама на ўзьнаньне ўсёй грамадзкасьці фабрыкі, заводу, накіраваньне рашучага агню супроць злосных ілжэўдарнікаў, спрытных рвацтву, разгільдзяйству, асабліваньню працоўнай дысцыпліны.

Для ілюстрацыі можна прывесьці наступныя паасобныя прыклады: па менскай рымарнай фабрыцы моў месца вымяваньня дэфіцытнымі таварамі «ударскай абутковай фабрыцы межі месца ганебнейшыя прарывы ў выкананьні прамфінпляну, парушэньня працоўнай дысцыпліны, рвацтва, пры ўсім гэтым ФЗК на працягу году зусім не займаўся пытаньнямі разгортваньня сацспаборніцтва. Замест прадугледжанага прамфінплянам выпуску 95 проц. абутку першага гатунку, выпускалася толькі 20-30 проц. Такое невыстарчальнае пагаршаньне кіраўніцтва сацспаборніцтвам мае ў канчатковым выніку рад буйнейшых прарываў у выкананьні колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінпляну.

84 ПРОЦ.—ВЫНІК КЕПСКАГА КІРАЎНІЦТВА

Вынікі работы прамысловасьці БССР за першы квартал 1931 г., калі прамфінпляна выканан толькі на 84 проц., калі ўдарным кварталам, аруху ў паляпшэньні якасных паказальнікаў, калі адначасова з гэтымі недапушчальнымі зьявішчамі выпукляюцца і іх простыя вытокі: рост прагулаў па плённаважных прычынах, невыкананьне заданьня па ўзьняцьці прадукцыйнасьці пры перавыкананьні лімітаў на зарплату і г. д.—сьведчыць, што пры вялікім росьце ўдарніцтва, энтузіязму і ініцыятывы найшырэйшых мас рабочае клясы кіраўніцтва гэтым рухам усё яшчэ адстае.

Другая гадавіна сацспаборніцтва і ўдарніцтва агаляе спаборніцтва і ўдарніцтва, абагуленьне вялікіх посьпехаў, яшчэ ёсьць на аснове правядзеньня ў жыцьцё ленінскай ідэі аб сацспаборніцтве—павінна ўзьняць справу сацспаборніцтва на новую хвалю. XVI зьезд партыі вызначыў ролю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўнае зьвяно ў ажыўленьні і паляпшэньні ўсёй работы прафсаюзаў і ўцягненьні шырокіх рабочых мас у кіраваньне вытворчасьцю. Неабходна з трэцяй гадавіны, якая супадае з трэцім рашаючым годам, у значна большай ступені ахапіць усе галіны работы сацспаборніцтвам.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЛЕНІНСКАГА САЦСПАБОРНІЦТВА

Пытаньні рэкордных прадукцыйнасьці, угрунтаваных на высоўваньні рабочымі цэхаў і агрэгатаў рацыяналізатарскіх прапаноў, сустрэчных поры і расцэнак, пытаньні ўсямернага паляпшэньня якасьці прадукцыі, пытаньні безагаворачнага выкананьня колькасных паказальнікаў пляну—вось чаго павінна дабівацца рабочая кляса, вось у чым асноўная задача праф. і гаспадарчых арганізацый у прамысловасьці.

Другая гадавіна дала новы магутны штурчок далейшаму разьвіцьцю і ўзмацненьню сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Замест адсоўных невяжніка кольскасьці мёртвых душ Ільліча-ўдарнікаў армія ўдарніцтва папоўніла свае рады новымі сотнямі і тысячамі лепшых рабочых прадпрыемстваў, саўгасаў і ўстаноў. У адказ на прызыў тульскіх рабочых яшчэ больш вырас лік ударных і «сквозных» брыгад, яшчэ шырэй разгарнулася ініцыятыва рабочае клясы, пакіраваная на барацьбу за плян вялікіх работ. Пад кіраўніцтвам нашай партыі пралетарыят упэўненым крокам будуе сацыялізм.

1 мая з міжнароднага сьвята працы на ўмовах СССР ператвараецца ў сьвята сацыялістычнай, гэройскай, ударнай працы. Вышэй разгорнуты сьцяг сацыялістычнай ударнай працы! Вышэй сьцяг ленінскага сацспаборніцтва!

С. КАМЭНШТЭЙН.